

ГЕОРГІЙ КАЛДУН: «ЧАЛАВЕКАМ ТРЭБА ЗАСТАВАЦЦА ЗАЎСЁДЫ»

ЧЫРВОНКА

АДЗНАЧЫЦЬ СВЯТА Ў... БІБЛІЯТЭЦЫ

ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЛЮТАГА 2020 г. ЧАЦВЕР № 29 (29143)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей КАВАЛЬЧУК, міністр спорту і турызму:**

*«Патрабаванні да адбору на Алімпіяду сталі больш жорсткія. Нягледзячы на гэта, мы ідзём па графіку мінулага алімпійскага чатырохгоддзя. Мы бачым, што на старты ў Токіа, акрамя 69 спартсменаў, якія ўжо выканалі нарматывы, могуць адабрацца яшчэ каля 30 чалавек. Хтосьці зробіць гэта па рэйтынгу, хтосьці зможа выйграць ліцэнзію на адборачных турнірах. Адпаведная работа вядзецца. Калі такіх спартсменаў будзе больш, значыць, для нас жа будзе лепш».*

# З УСПАМІНАЎ АБ НЕБЕ



Былы пілот грамадзянскай авіяцыі, лётчык-выпрабавальнік, а цяпер сталічны пенсіянер Валянцін ГОСЦЕЎ у свой час выконваў адказныя палёты з вышэйшымі асобамі Беларусі — на борце яго вінтавога самалёта «ІЛ-14» часта бывалі Кірыл Мазураў і Пётр Машэраў, якім было неабходна ляцець з Мінска ў Маскву. Прайшло болей за пяцьдзесят гадоў, а тыя «паветраныя» гадзіны, праведзеныя за штурвалам лайнера, васьмідзесяцідвухгадоваму Валянціну Аляксеевічу ўзгадваць асабліва прыемна: як-ніяк, яму давяралі выконваць дзяржаўную, а можа, і гістарычную місію. Экс-пілота цяпер нярэдка можна ўбачыць на колішняй узлётна-пасадачнай паласе аэрапорта Мінск-1, на якой цяпер узводзяцца кварталы шматфункцыянальнага жыллёвага комплексу «Мінск—Мір» і пракладваюцца новыя дарогі ды вуліцы, дзе зроблены гэты здымак. У апошнія гады сваёй лётнай кар'еры наш герой выпрабоўваў рэактыўныя пасажырскія лайнеры «ТУ-124», «ТУ-134», «ЯК-40» і «ЯК-42» пасля капрамонту на авіязаводзе, якія таксама месціўся на тэрыторыі старога аэрапорта.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Замежныя інвестары ўклалі ў 2019 годзе ў эканоміку Беларусі $10 млрд.**
- У Віцебску нарадзіліся першыя ў гэтым годзе трайняты.



- **У Беларусі падрыхтаваны праект указа аб пераўтварэнні лясгасаў у дзяржаўныя казённыя прадпрыемствы.**
- Турыстычны комплекс плануюць пабудаваць у Магілёве ў парку Падніколле. Ён размесціцца на беразе Дняпра, а тэраса будзе знаходзіцца непасрэдна над вадой.
- **Трансляцыю адкрытых судовых пасяджэнняў у інтэрнэце плануецца ўрэгуляваць заканадаўча.**

Сталічны час

# МІНСК БУДУЕ «САЦЫЯЛКУ»

### Яшчэ ніколі не было такога, каб у горадзе пачалі ўзводзіць або праектаваць адразу 28 дзіцячых садкоў

**А сапраўды, у апошнія гады ў сталіцы ў новых мікрараёнах жыллё будавалася апераджальнымі тэмпамі. Аб'ектаў сацыяльнага прызначэння відавочна не хапала, асабліва цяжкая сітуацыя склалася з дзіцячымі садкамі. Бацькі вазілі сваіх карапузаў на далёкія вуліцы раёнаў ці нават у іншыя мікрараёны... І вось нарэшце спраўдзілася. У інвестыцыйнай праграме мегаполіса павялічылася колькасць аб'ектаў сацыяльнага прызначэння: сярэднія школы, аб'екты дашкольнай адукацыі і аховы здароўя будуць будаваць масава — там, дзе іх сапраўды не хапае, паведаміла старшыня камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Ірына ГОНТАРАВА.**

### Фінансаванне вырасла ў разы

Па словах старшыні камітэта, цяпер у Мінску праектуюцца і будуюцца 44 аб'екты адукацыі, 28 дзіцячых дашкольных устаноў, 28 аб'ектаў аховы здароўя.

Агульны аб'ём сродкаў, накіраваных на праектаванне, будаўніцтва і рэканструкцыю аб'ектаў аховы здароўя ў 2020—2021 гадах, роўны 179,8 млн рублёў. У параўнанні з мінулым годам гэтая сума павялічылася ў два разы. На ўстановы адукацыі, у тым ліку дашкольныя, выдзелена 109,5 млн рублёў (у 2019 годзе гэтая сума была меншая прыблізна на 25 млн). Бюджэт на будаўніцтва і рэканструкцыю аб'ектаў сацыяльнай абароны вырас у тры разы і складае 3 млн рублёў.

СТАР. 3

Сардэчна запрашаем!

# Халяльная кухня, трохзоркавыя гатэлі і... беларуская мова

### Чым завабіць замежных турыстаў у нашу краіну?

**Буйныя спартыўныя мерапрыемствы, бязвіз і прадуманая карпатлівая работа прадстаўнікоў тургаліны пачалі даваць свой плён — да нас паехалі замежнікі. Прычым мы пакуль не паспяваем за тэмпамі росту цікавасці да нашай краіны — трэба яшчэ шмат зрабіць для таго, каб якасна абслужыць усіх гасцей. Напрыклад, Беларусь пакуль не гатова да наплыву турыстаў з мусульманскіх краін, якім неабходна спецыфічнае меню, у Мінску ж рэстараны з халяльнай ежай можна пералічыць па пальцах.**

СТАР. 4



ISSN 1990 - 763X

# «НАШЫ НАВІНЫ, НАША СУМЛЕННАЯ ПАЗІЦЫЯ ПАВІННЫ БЫЦЬ ДАНЕСЕНЫЯ ДА КОЖНАГА І ПАЧУТЫЯ ЎСІМІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт добра разумее, якая жорсткая сёння канкурэнцыя на інфармацыйным полі. Беларусь з усіх бакоў працятая рознымі медыйнымі патокамі, многія з якіх адкрыта дэструктыўныя.

Больш за тое, на нядаўняй сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным у Сочы Аляксандр Лукашэнка ў тым ліку абмяркоўваў публікацыі на беларускую тэматыку ў шэрагу расійскіх СМІ і Telegram-каналаў.

«І не трэба нас параўноўваць з такімі дзяржавамі, здаецца, як мы, — Швейцарыяй, Аўстрыяй і гэтак далей, — бо гэтыя дзяржавы існуюць у складзе магутнага, велізарнага Еўрапейскага саюза і заўсёды абапіраюцца на сваіх саюзнікаў. Прынамсі, у спіну ім не страляюць. ***Мы ж знаходзімся ў такім становішчы, што нам і ад саюзнікаў дастаецца, і ад супернікаў*** (ці ворагаў, як мы называлі). І ў гэтым плане Беларусь прастрэльваецца з усіх бакоў», — расставіў кропкі над «і» лідар краіны.


Фота БелТА.

У буйных замежных СМІ ў адносінах да нашай краіны часта з'яўляюцца інсінуацыі, а часам і зусім яўныя хлусня і паклёп. У такіх няпростых умовах, лічыць Аляксандр Лукашэнка, ***надзвычай важна ўзяць і ўтрымаць увагу, але пры гэтым не страціць давер гледачоў, чытачоў і слухачоў.*** Неабходна сумленна і аб'ектыўна гаварыць з аўдыторыяй на зразумелай мове.

«У нас гэтага крыху не хапае. ***Адрозненне нашых сродкаў масавай інфармацыі — ашаламляльнае адрозненне на нашу карысць — у тым, што мы нашмат больш сумленныя.*** Беларускія СМІ абсалютна праўдзіва выкладаюць тую ці іншую тэму альбо інфармацыю», — ацаніў Прэзідэнт.

## БОЛЬШ АНАЛІТЫКІ

Не сакрэт, што кіраўнік дзяржавы асабіста ўважліва сочыць за беларускай медыйнай прадукцыяй. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што інтэрнэт не здолее перацягнуць абсалютную большасць аўдыторыі ў анлайн.

«Канешне, апошнім часам інтэрнэт усё больш і больш заваёўвае сваю прастору. Няхай гэта будзе на дадзеным этапе як дадатак да традыцыйных СМІ. Можа, яны ўжо дзесьці ўпоравень выйшлі, крыху наперад па некаторых кірунках, але традыцыйныя сродкі масавай інфармацыі будуць заўсёды. ***На навінку заўсёды кідаюцца, асабліва моладзь. Пройдзе час, усё гэта схлыне, застанецца на сур'ёзным узроўні»***, — мяркуе кіраўнік краіны.

Па яго словах, таленавіты журналіст можа і павінен быць лідарам грамадскай думкі. ***Сёння аблічча любога СМІ павінна вызначаць аўтарская журналістыка.*** А сродкам масавай інфармацыі неабходныя новыя асобы, цікавыя персаналіі, цікавыя тэмы. Пры гэтым Прэзідэнт заўважыў, што часта ў эфіры не хапае вастрыні і аператыўнасці.

Таму ад тэлебачання Аляксандр Лукашэнка чакае адыходу ад замежных платформаў, бо далёка не ўсё, што там ёсць, добрай якасці, а Беларусі трэба больш уласнай тэлепрадукцыі. Друкаваным СМІ, каб утрымацца на плаве ў сучасным лічбавым свеце, Прэзідэнт параіў актыўна займацца аналітыкай.

«Канешне, мы заўсёды былі і будзем аб'ектыўныя. ***Але нашы навіны, наша сумленная пазіцыя павінны быць данесеныя да кожнага і пачутыя ўсімі. Нам увогуле саромецца няма чаго*** (а ў нас часам гэта бывае). Мы працуем на сваю краіну і свой народ. Дзякаваць богу, мы ўжо адышлі ад таго, што было ў сярэдзіне 90-х, пасля распаду Савецкага Саюза, калі журналісты ўсе былі «нашы», «не нашы». Вы ўжо на роўных з імі канкуруеце, у вас ужо камяні так не кінуць», — звярнуўся да кіраўнікоў СМІ Аляксандр Лукашэнка.

**Варвара МАРОЗАВА.**

### Дарэчы

Згодна з інфармацыяй прэс-службы Прэзідэнта, на пачатак года ў нашай краіне зарэгістравана 1614 друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, 9 інфармагенцтваў, 20 сеткавых выданняў, 270 тэлерадыёвяшчальных СМІ. Акрамя таго, на тэрыторыі краіны распаўсюджваецца больш за 270 замежных тэлепраграм і каля трох тысяч замежных друкаваных СМІ.

### У тэму

Міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр Карлюкевіч паведаміў журналістам, што пастаўленыя Прэзідэнтам на нарадзе (яна, між іншым, доўжылася больш за тры гадзіны) канкрэтныя задачы ў большай ступені датычыліся якасці медыяпрадукту. У прыватнасці, у Беларусі плануецца стварэнне айчыннага медыявымяральніка, які мае пачаць працаваць ужо сёлета і будзе вырашаць задачы для ўсяго рынку тэлевізійнай рэкламы, і навіннага тэлевізійнага канала.

«Безумоўна, ішла гутарка аб тым, што сённяшні парадак дня на старонках газет, электронных сродкаў масавай інфармацыі мусіць адпавядаць задачам, якія краіна будзе вырашаць сёлета», — дадаў міністр.

# «Кітайцы павінны ведаць, што беларусы — стойкія і надзейныя людзі і сапраўдныя сябры»

## Якія задачы Прэзідэнт паставіў перад новым паслом у Кітаі

**Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што з дыпламатычнай місіяй пасол едзе ў няпросты перыяд. «І справа не толькі ў тым, што вірус там, — свет перажываў і больш складаныя абставіны. Справа ў тым, што ў сувязі з гэтым каранавірусам пачынаюцца розныя ўкіды ў медыйную прастору, фэйкавыя навіны і гэтак далей. Кітайцы павінны ведаць, што беларусы — стойкія і надзейныя людзі і сапраўдныя сябры», — падкрэсліў кіраўнік краіны.**

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што кітайскі бок добра ўспрыняў прызначэнне Мікалая Снапкова паслом.

«Прэзідэнт даручыў на месцы комплексна, зыходзячы з бягучых умоў, абмеркаваннях з кітайскімі партнёрамі, разгледзець кірункі, канкрэтыку і самае галоўнае — тое, як рэалізаваць рост эканамічнага патэнцыялу супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі. Мэта — эканамічны рост нашай краіны», — расказаў Мікалай Снапкоў журналістам пасля сустрэчы з кіраўніком дзяржавы.

На першым месцы сярод задач беларускага пасольства ў КНР — экспарт беларускай прадукцыі і разумны імпарт, асабліва датычна прамежкавых тавараў.

«Прамежкавыя тавары даюць нам істотную эканомію ў адносінах да аналагічных тавараў такой жа якасці, якія пастаўляюцца з Расійскай Федэрацыі і Еўрапейскага саюза, — растлумачыў Мікалай Снапкоў. — Такая эканомія, па разліках Міністэрства эканомікі, у год складае 400 мільёнаў долараў. Як вы разумееце, гэта ўплывае на рост дабаўленага кошту і, адпаведна, рост ВУП. Размова пра тое, што трэба пісьменна працаваць з камплектуючымі, якія пастаўляюцца на нашы прадпрыемствы».

Вяртаючыся да базавага патрабавання кіраўніка дзяржавы — нарошчвання беларускага экспарту ў Кітай, пасол адзначыў, што Беларусь — экспартаарыентаваная краіна, а Кітай — невычарпальны рынак, які расце.

«Мы маем і гандлёвыя бар'еры, і мытныя бар'еры, і недастатковы ўзровень вытворчасці для пастаўкі запатрабаваных кітайскім рынкам тавараў. Усё гэта трэба яшчэ раз прааналізаваць у практыкапрымяняльным характары і далажыць Прэзідэнту з выхадам на адпаведныя яго даручэнні канкрэтным асобам», — дадаў ён.

Мікалай Снапкоў не стаў называць канкрэтную дату свайго ад'езду, але сказаў, што гэта адбудзецца хутка.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## «Фіяна фойл» перамагла на парламенцкіх выбарах у Ірландыі




Вынікі падліку галасоў датэрміновых выбараў паведаміў нацыянальны тэлеканал RTE. Апазіцыйная партыя «Фіяна фойл» атрымала 38 са 160 дэпутацкіх мандатаў, нацыянал-рэспубліканская партыя «Шын фейн» — 37. Для апошняй гэта самая вялікая колькасць крэслаў у сваёй гісторыі. Аналітыкі кажуць аб «палітычным землятрусе», кіраўніцтва партыі называе зыход датэрміновых выбараў «рэвалюцыяй». Кіруючая цяпер кансерватыўная партыя «Фінэ гэл» мае ў актыве 35 мандатаў, саступіўшы сваім галоўным супернікам. Партыі «зялёных» дасталіся 12 месцаў у парламенце, лейбарысты і сацыял-дэмакраты атрымалі па шэсць мандатаў. Першае пасяджэнне парламента новага склікання адбудзецца 20 лютага, удакладніў RTE. Для фарміравання большасці трэба не менш за 80 мандатаў. Пры гэтым аналітыкі не бачаць магчымасці саюза для любых дзвюх партый з ліку лідараў. У любым выпадку перагаворы могуць працягвацца некалькі тыдняў. Палітолагі асцярожна спадзяюцца, што пагадненне будзе дасягнута хоць бы да нацыянальнага свята, Дня святога Патрыка, 17 сакавіка.

## Філіпіны спыняюць дзеянне ваеннай дамовы з ЗША



Міністэрства замежных спраў Філіпін апавясціла ЗША аб скасаванні дамовы аб замежных узброеных сілах. Пра гэта на сваёй старонцы ў «Твітэры» паведаміў намеснік міністра замежных спраў Дадо Дзюлай. Як адзначае выданне Manila Bulletin, пагадненне спыніць сваё дзеянне праз 180 дзён з моманту атрымання Вашынгтонам дадзенага ліста. Дамова аб статусе замежных узброеных сіл (Visiting Forces Agreement) была падпісана ў 1998 годзе і рэгулюе правілы ўезду і знаходжання амерыканскіх вайскоўцаў на Філіпінах, падаючы таксама юрыдычную аснову для правядзення сумесных вучэнняў на тэрыторыі краіны. Аб рашэнні спыніць дзеянне пагаднення прэзідэнт Радрыга Дутэртэ абвясціў у студзені, пасля адмовы Вашынгтона выдаць візу філіпінскаму сенатару Ранальду дэла Росэ. Такі крок разглядаецца прэзідэнтам як умяшальніцтва ва ўнутраныя справы Манілы.

## У Расіі пералічаць белых мядзведзяў

Аб гэтым паведаміла прэс-служба Мінпрыроды РФ. «Такім чынам, упершыню ў гісторыі будуць атрыманы самыя поўныя дадзеныя аб стане папуляцыі белага мядзведзя на тэрыторыі нашай краіны», — растлумачылі ў Мінпрыроды. Плануецца, што ў 2021 годзе навукоўцы правядуць авіяўлік белых мядзведзяў у Чукоцкім і Усходне-Сібірскім морах, у 2022-м — у моры Лапцевых і Карскім моры, а ў 2023-м — ва ўсходняй частцы Баранцавага мора і акваторыі Зямлі Франца Іосіфа. Фінансаваць праект мае намер «Раснафта». Увесь 2020 год будзе прысвечаны падрыхтоўцы да маштабных даследаванняў. Плануецца распрацаваць, зацвердзіць і ўзгадніць дэталёвы план адпаведных работ, правесці трэнінгі для ўдзельнікаў праекта, закупіць абсталяванне, а таксама распрацаваць метадычныя рэкамендацыі па падліку. У міністэрстве нагадалі, што ўсе тры папуляцыі белага мядзведзя, якія знаходзяцца ў Расіі, занесены ў Чырвоную кнігу.



Да ведама

# Тэрмін службы залічаць у страхавы стаж

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 10 лютага падпісаў Указ № 48 «Аб павышэнні ўзроўню сацыяльнай абароны грамадзян у сувязі з прызывам на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве». Пра гэта паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

Такім чынам, з 1 студзеня салдаты, якія знаходзяцца на тэрміновай ваеннай службе або служаць у рэзерве, падлягаюць абавязковаму дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню на выпадак пенсійнага ўзросту, інваліднасці або страты карміцеля. Дакумент рэгламентуе парадак выплаты абавязковых узносаў за перыяды ваеннай службы. Гэта, у сваю чаргу, дазволіць залічваць такія перыяды ў страхавы стаж, які і вызначае права на працоўную пенсію.

Акрамя таго, для тых, хто ўжо адслужыў, таксама прадугледжаны шэраг ільгот. Датычацца яны падрыхтоўкі да паступлення ў навучальныя ўстановы. У год звальнення або ў наступны год пасля гэтага можна будзе вучыцца на падрыхтоўчых факультэтах, аддзяленнях і курсах у дзяржаўных установах сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі за бюджэтны кошт. Але для гэтага трэба мець сярэдні паказчык у дакуменце аб адукацыі не ніжэй за шэсць балаў і рэкамендацыю з воінскай часці. Таксама тыя, хто адслужыў, атрымаюць пераважнае права выбару месца работы па спецыяльнасці падчас размеркавання.

Цяпер члены сям'і вайскоўца яшчэ змогуць карыстацца жылым памяшканнем дзяржаўнага жыллёвага фонду ў інтэрнатах на ўвесь перыяд яго тэрміновай службы.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Блізкая ўлада

# Пачуць і дапамагчы

**Больш за дваццаць чалавек выслухаў падчас выязнога прыёму ў Маладзечне памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ.**

Як заўсёды не абышлося без жыллёвых пытанняў. Алена Васілеўна жыве ў арэнднай кватэры, у жніўні мінулага года яна напісала заяву аб выдзяленні сацыяльнага жылля. Аднак ёй адмовілі. Прычына — яе штомесячны сукупны даход перавышае пражытковы мінімум. Акрамя таго, жанчына прасіла паменшыць ёй арэндную плату, якая складае 180 рублёў у месяц. У яе невялікая пенсія, дзеці таксама дапамагчы не могуць. Алена Васілеўна не супраць працаваць, каб мець хоць і невялікую прыбаўку да пенсіі, але яе не бяруць на работу, паколькі ёй 67 гадоў. Ігар Яўсееў даручыў прадстаўнікам мясцовай улады разгледзець і прапанаваць жанчыне варыянты працаўладкавання.

А начальнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі Сяргей Бохан прапанаваў пенсіянерцы пакой у інтэрнаце, за які давядзецца плаціць усяго 15—20 рублёў. Тым больш што выбар ёсць. Як адзначыў старшыня райвыканкама Юрый Горлаў, у горадзе налічваецца звыш 50 інтэрнатаў. Маладая маці Таццяна пражывае ў інтэрнаце, выхоўвае малое дзіця. Дзяўчына — сірата, стаіць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў з 18 гадоў. Таццяне прапануюць арэнднае або сацыяльнае жыллё. Пытанне ўзялі на кантроль.

Жыхары вуліц Меліярацыйная і Гідратэхнікаў заклапочаны пытаннямі водаадвядзення. Для ўладкавання каналізацыі неабходна 250 тысяч рублёў. На гэтых вуліцах жывуць у асноўным пенсіянеры, а такая сума для іх непад'ёмная. Памочнік Прэзідэнта паабяцаў разабрацца ў сітуацыі і даручыў райвыканкаму сабраць інфармацыю аб пражываючых там пенсіянерах, каб паглядзець, чым ім можна дапамагчы.

Канстанцін Козел з вёскі Краснае прыйшоў на прыём ад імя землякоў, якія жывуць на вуліцы 1 Мая. Рака Уша, што працякае побач, часта разліваецца, падтапляе падвалы, калодзежы. Мужчына асцерагаецца, што пітная вада забруджваецца. Мінулай вясной узровень жалеза быў у дзесяць разоў больш дапушчальнай нормы. Аднак, згодна з аналізамі водаканала, ніякага перавышэння не зафіксавана. Ды заяўнік не давярае спецыялістам. Выхад з сітуацыі — пракладка водаправода, але побач праходзіць аўтамагістраль, што ўскладняе правядзенне работ. **Ігар Яўсееў даручыў разгледзець магчымасць устаноўкі калонак, якія часова дапамогуць зняць праблему.**

Частка пытанняў датычылася зямельных адносін. У прыватнасці, Анастасія Яўгенаўна прасіла дапамагчы ў афармленні ўчастка для вядзення фермерскай гаспадаркі. Як паведаміла начальнік аддзела землеўпарадкавання Марына Чарняк, працэдура па выдзяленні зямлі прыпынена, паколькі выяўлена самавольнае збудаванне. Зямлю могуць прадаставіць толькі пасля зносу пабудовы, закон адзін для ўсіх, рэзюмаваў Ігар Яўсееў.

— Кіраўнік дзяржавы вызначыў 11 гарадоў як паказальныя. У ліку іх і Маладзечна. Мы пастараемся ствараць тут самыя камфортныя ўмовы для працы, адпачынку, жыцця людзей. Няхай нейкія пытанні не зможам вырашыць адразу, але чалавеку параім, падкажам, растлумачым, што рабіць далей, — адзначыў напрыканцы прыёму Ігар Яўсееў.

А пасля памочнік Прэзідэнта пабываў у філіяле «Мінаблтранса» — аўтобусным парку № 4. Раней там узнікалі вытворчыя праблемы, цяпер абнаўляецца рухомы састаў. Ігар Яўсееў пагутарыў з калектывам, кіраўніцтвам прадпрыемства, пацікавіўся, як ідуць справы, на свае вочы пабачыў сітуацыю.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Ва ўрадзе

# ЗАРОБКІ Ў ПРЫЯРЫТЭЦЕ

## Падтрыманне ўзроўню рэальных заробкаў — задача нумар адзін для ўрада ў гэтым годзе

**Савет Міністраў правёў пасяджэнне па выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця. У першым квартале арганізацый, у якіх не забяспечваўся належны ўзровень заработнай платы, павінны выйсці на 500 беларускіх рублёў. Персанальная адказнасць за гэта, як адзначыў прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС, на мясцовых кіраўніках. Але галоўная ўмова застаецца непахіснай — заробкі павінны быць напрацаваны.**

Асобную ўвагу на пасяджэнні надалі выканальніцкай дысцыпліне. Асабліва тут адстаюць Мінжылкамгас, Мінскі і Гомельскі гарвыканкамы.

«Мы прааналізавалі, як выкананы даручэнні прэм'ер-міністра, рашэнні Савета Міністраў і яго Прэзідыума, па якіх патрабаваўся даклад ураду. Выснова: амаль пятая частка даручэнняў выканана з парушэннем устаноўленых тэрмінаў», — перадае словы прэм'ер-міністра БелТА.

Задачы кіраўнік урада паставіў і перад IT-сектарам. Галіна павінна быць больш арыентавана на беларускую, а не замежную эканоміку. Дарэчы, сувязь і інфармацыя — сферы, якія зрабілі значны ўнёсак у рост эканомікі краіны ў 2019 годзе. І такая сітуацыя характэрна не толькі для Міншчыны, дзе размешчаны Парк высокіх тэхналогій. Ён стаў значным суб'ектам, які забяспечвае паступленне валюты ў краіну. «Гэта добра, але IT-сектар павінен больш працаваць на беларускую эканоміку. Пакуль жа ўзровень узаемадзеяння ўнутры краіны па гэтым кірунку цяжка назваць дастатковым — усе найноўшыя распрацоўкі працуюць на эканоміку іншых краін», — сказаў кіраўнік урада.

Звярнуў увагу Сяргей Румас і на зніжэнне ўзроўню работы з інвестарамі на месцах. Паказчыкі па прыцягненні прамых замежных інвестыцый не выканалі чатыры рэгіёны: Брэсцкі, Віцебскі, Гродзенскі і Мінскі.

На слыху

# Кодэкс для педагога: непрадузятасць, карэктнасць і павага

**Прыкладныя этычныя правілы педагагічных работнікаў апублікаваны на сайце Міністэрства адукацыі. Абмяркоўваць праект дакумента спецыялісты і педагогі будуць да 1 сакавіка.**

З'яўленне своеасаблівага «Этычнага кодэкса» настаўнікаў анансаваў на мінулым тыдні міністр адукацыі Ігар Карпенка. Мяркуецца, што падобны збор правілаў дапаможа ў прадухіленні канфліктных сітуацый, якія пачасціліся ва ўстановах адукацыі апошнім часам.

Аснову кодэкса складуць прынцыпы педагагічнай этыкі: ненасілля, аўтаноміі, талерантнасці, адказнасці, справядлівасці, павагі да правоў і годнасці іншага чалавека, кампетэнтнасці, прыстойнасці.

Ад педагагічнага работніка пры ажыццяўленні прафесійнай дзейнасці патрабуецца ствараць і падтрымліваць паважлівыя і даверныя адносіны ў педагагічным калектыве і калектыве навучэнцаў, не дапускаць ацэнак і выказванняў, што прыніжаюць гонар і годнасць калег, навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў.

Патрабуецца таксама пазбягаць сітуацый, здольных нанесці шкоду дзелавой рэпутацыі педагагічнага работніка або ўстановы адукацыі. Праблемы педагагічнай сферы павінны абмяркоўвацца ў паважлівай форме, а рашэнні — прымацца ў адкрытых педагагічных дыскусіях. Педагог павінен спакойна ўспрымаць крытыку, умець прызнаваць свае памылкі, пазбягаць канфліктаў ва ўзаемаадносінах, імкнуцца да карэктнага вырашэння спрэчных пытанняў як у прыватным, так і ў грамадскім жыцці.

Не дапускаюцца абмеркаванне рабочых момантаў, публічнае перадузятае абмеркаванне ўстановы адукацыі, у тым ліку ў інтэрнэце.

Забараняецца злоўжываць службовым становішчам, патрабаваць ад навучэнцаў (законных іх прадстаўнікоў) якіх-небудзь паслуг, узнагароды за сваю працу (дадатковую ў тым ліку).

Ад настаўнікаў патрабуецца праяўляць павагу да сямейных, культурных і канфесійных традыцый навучэнцаў. Неабходна прытрымлівацца этычных нормаў у медыяпрасторы, не дапускаць размяшчэння ў сеціве інфармацыі, якая можа нанесці шкоду здароўю або развіццю дзіцяці. Педагог не можа паведамляць іншым асобам інфармацыю, даверaную яму асабіста вучнем. Нельга дапускаць выпадкі прымянення метадаў фізічнага, маральнага і псіхічнага гвалту ў дачыненні да навучэнцаў.

Пры ацэнцы вучэбных дасягненняў настаўніку трэба быць аб'ектыўным і справядлівым, не дапускаць тэндэнцыйнага заніжэння або завышэння ацэначных балаў, не ставіць пад публічную крытыку асобы навучэнца і яго законных прадстаўнікоў.

Педагогі абавязаны добрасумленна і якасна выконваць свае прафесійныя абавязкі, клапаціцца пра прэстыж прафесіі, паважаць гонар і годнасць калег, не допускаць дзеянняў, якія наносяць шкоду аўтарытэту педагагічных работнікаў.

Знешнім выглядам, характарам і паводзінамі, культурай зносін педагог павінен адпавядаць традыцыям і нормам прафесійнай супольнасці, падтрымліваць прафесійны гонар педагагічнага работніка, яго місію, абараняць свой аўтарытэт, аўтарытэт сваіх калег, не абмяркоўваць з навучэнцамі і іх законнымі прадстаўнікамі недахопы калег. Не пераносіць свае асабістыя сімпатыі і антыпатыі на службовыя адносіны.

Асобны пункт забараняе «нетактоўнае ўмяшанне» ў асабістае жыццё, праявы зайздрасці, нядобразычлівасці, прымяншэння заслуг іншых педагагічных работнікаў.

У праекце прапісана, што педагог павінен прытрымлівацца такога спосабу жыцця, які не наносіць шкоду прэстыжу прафесіі і адносінам з навучэнцамі і не перашкаджае якаснаму выкананню прафесійных абавязкаў. Таксама ў праекце правіл замацаваны дзелавы стыль адзення для педагогаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Будзьце пільныя!

# РАЗДОЛЛЕ ДЛЯ ФІШАРАЎ

## Распрацоўшчыкі антывірусаў нагадваюць аб пастках для кашалькоў карыстальнікаў

**Напярэдадзе новая хваля свят, а значыць, ёсць імавернасць, што «прасунутыя» зладзеі зноў узмоцняць сваю актыўнасць. «Лабараторыя Касперскага» рэкамендуе быць асабліва пільнымі ў гэты час. Прааналізаваўшы актыўнасць зламыснікаў у перадНавагодні перыяд мінулага года, эксперты кампаніі высветлілі, што доля фінансавага фішынгу ў гэты час па ўсім свеце вырасла на 9,5 % і склала амаль 53 % ад усіх спроб злачынных нападаў.**

Так, за некалькі дзён да «Чорнай пятніцы» колькасць заблакіраваных спроб пераходу на падробленыя копіі eBay вырасла ў чатыры разы і перавысіла восем тысяч штодня. Такі ўзровень трымаўся да сярэдзіны снежня. Амаль кожнае пятае фішынгавае паведамленне ў чацвёртым квартале было скамерскае, гэта значыць уяўляла сабой ашуканскую аб'яву, якая абяцала карыстальніку лёгкія грошы, напрыклад, за ўдзел у акцыі або праходжанне апытання. Як звычайна ў такіх выпадках, наведвальнікам прапаноўвалася выканаць нескладанае заданне, у тым ліку звязанае з увядзеннем асабістых звестак, і аплаціць невялікую камісію за перавод сродкаў. Ашуканцы зарабляюць менавіта на гэтай «камісіі»: атрымаўшы яе, яны спыняюць зносіны з ахвярай скаму.




«Перад вялікімі святамі людзі часцей схільныя да здзяйснення імпульсіўных купляў. Зламыснікі заўсёды актывізуюцца ў гэты час, бо ў мітусні карыстальнікі часцей прымаюць за чыстую манету прапановы купіць нешта добрае па фантастычна нізкай цане. Вядома, гэта не значыць, што трэба цалкам адмаўляцца ад шопінгу, але мы рэкамендуем карыстальнікам заўсёды заставацца вельмі ўважлівымі пры правядзенні анлайн-аплат», — каментуе **Таццяна СІДОРЫНА, старшы кантэнт-аналітык «Лабараторыі Касперскага».**

Каб не стаць ахвярай фішараў, лабараторыя рэкамендуе карыстальнікам:

- здзяйсняць анлайн-куплі толькі ў афіцыйных крамах;
- уважліва правяраць, ці карэктна напісана назва анлайн-крамы ў адрасным радку: калі яна адрозніваецца ад арыгінала хоць на адзін знак, не варта там нічога купляць;
- не выкарыстоўваць адзін і той жа пароль для некалькіх сэрвісаў, таму што калі ён будзе скрадзены, будуць скампраметаваныя ўсе акаўнты.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ПРАЦЯГНУЦЬ РУКУ ДАПАМОГІ



## Ад Эквадора да Непала

— Гуманітарнае супрацоўніцтва можна назваць нашым прыярытэтным кірункам, — адзначыў Дзмітрый Ткачук. — Ён фарміруе прэстыж і рэпутацыю краіны, якая імкнецца скарыстаць усе магчымасці, каб аказаць дапамогу дзяржавам, якія апынуліся ў бядзе. Гэта спрыяе развіццю стасункаў і па іншых кірунках.

Натуральна, толькі Паднябесная наша дапамога не абмяжоўваецца. За апошнія некалькі гадоў каштоўныя грузы накіроўвалі ў Венесуэлу, Украіну, Лівію, Турцыю, Непал, Сірыю, Эквадор, Мазамбік, Зімбабвэ, В'етнам. Апошнюю краіну вельмі моцна «патрапаў» у 2018 годзе магутны тайфун. Але сказаць, што ўвесь час адпраўляюцца адны і тыя ж грузы, нельга. Хоць часцей за ўсё ўсе нагоды можна падвесці пад адзін знаменальнік — масавае разбурэнне жылых дамоў і інфраструктуры. Прымаючы бок сам вырашае, што яму патрэбна, ствараючы канкрэтны рэестр. Гэта неабходна і для таго, каб не адбылося так, што па адных пазіцыях будзе збыткоўнасць, а па другіх — наадварот, дэфіцыт ці ўвогуле адсутнасць.

Часам дзейнічаюць за мяжой і нашы ратавальнікі. Напрыклад, у 2011 годзе яны дапамагалі тушыць лясныя пажары ў Разанскай вобласці Расіі. Праз тры гады быў камандзіраваны атрад у Сербію, паколькі на гэтую балканскую краіну абрынуліся моцныя залевы, якія выклікалі паводку. Штогод нашы верталёты адпраўляюцца ў Турцыю і Грэцыю для ліквідацыі лясных пажараў. Прычым адбываецца гэта па выніках адмысловага міжнароднага тэндару. А гэта значыць, што нам давяраюць.

## Вучымся самі і вучым іншых

***— У сярэдзіне дзесяцігоддзя да нас не раз заходзілі лясныя пажары з тэрыторыі Украіны. І нашы пажарныя таксама дапамагалі ўкраінцам тушыць узгаранні ў памежнай зоне...***

— Менавіта таму ўжо вельмі даўно былі заключаны дамовы аб супрацоўніцтве ратавальных службаў з усімі краінамі, з якімі мяжуе Беларусь. Толькі гэтым мы не абмяжоўваемся. Агулам колькасць такіх пагадненняў ужо пераваліла за 50. З кімсьці мы супрацоўнічаем па лініі падрыхтоўкі ратавальнікаў, з кімсьці — па сумесных праектах.

***— Чаму ж вучаць нас і чаму вучымся мы?***

— Нашы супрацоўнікі адпраўляюцца на вучэбныя курсы за мяжу ў тым выпадку, калі трэба пераняць новы досвед, але ў сілу розных прычын арганізоўваць падобныя курсы ў Беларусі не зусім мэтазгодна. Прычына можа быць, напрыклад, у малой колькасці слухачоў, калі вузкія спецыялісты сапраўды на вагу золата. Яшчэ адзін фактар — прыродная асаблівасць нашай краіны. У нас жа няма гор. А як вучыцца працаваць у баявых умовах тым жа ратавальнікам-альпіністам? Ці вось не так даўно ў Кыргызстане праводзіліся пад эгідай Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай абароны вучэнні сярод вадалазаў. Ва Узбекістане былі міжнародныя трэніроўкі па працы ў горнай мясцовасці... Таксама мы вывучаем асаблівасці сучаснай грамадзянскай абароны насельніцтва, як гэта робіцца, напрыклад, у Еўрасаюзе.






Аднак, з іншага боку, і мы прымаем у сябе на базе Міжнароднага цэнтра падрыхтоўкі ратавальнікаў з іншых краін. Цэнтр функцыянуе на базе нашага філіяла Універсітэта грамадзянскай абароны ў Светлым Гаі непадалёк ад Барысава. Там ужо вучыліся прадстаўнікі больш чым з 50 краін. Сярод іх — Казахстан, Расія, Латвія, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Малдова, Іарданія. І мы прапаноўваем нашым калегам добры патэнцыял у галіне выратавальных прац. А гэта ўсё — экспарт адукацыйных паслуг.

З кожнай краінай вядзецца супрацоўніцтва, якое цікавае абодвум бакам. Напрыклад, з Японіяй у нас даўнія стасункі на глебе радыялогіі. Калісьці прадстаўнікі Краіны ўзыходзячага сонца дапамаглі нам падчас ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Ёсць і цяпер шэраг праектаў, па якіх яны нам дапамагаюць. А калі ў 2011 годзе ў самой Японіі адбылася надзвычайная сітуацыя на АЭС «Фукусіма-1», то ўжо Беларусь пачала дзяліцца сваімі напрацоўкамі. З таго часу да нас прыехала не адна японская дэлегацыя, якая вывучала наш постчарнобыльскі досвед. А па выніках аднаго з візітаў быў заключаны кантракт на пастаўку ў гэтую ўсходнюю краіну прыбораў дазіметрычнага і радыяцыйнага кантролю беларускай вытворчасці.

Дарэчы, цяпер ідуць перагаворы аб пастаўках нашай пажарна-выратавальнай тэхнікі, а таксама амуніцыі ў краіны Сярэдняй Азіі.

## Дзесяць дзён аўтаномнасці

— Другі блок — супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі, — працягвае суразмоўца. — Наш Рэспубліканскі атрад спецыяльнага прызначэння атэставаны па стандартах INSARAG. Гэта патрабаванне ААН да адмысловых атрадаў, якія гатовы аператыўна вылятаць і аўтаномна працаваць у пацярпелай краіне да дзесяці сутак. Прычына вылету — надзвычайная прыродная сітуацыя. Гэта землятрусы, паводкі, тайфуны і цунамі. Прычым усе удзельнікі такога атрада абавязкова павінны валодаць англійскай мовай.

Нашы ратавальнікі актыўна працуюць у праграмах трансмежнага супрацоўніцтва па лініях Беларусь—Латвія—Літва і Беларусь—Польшча—Украіна. І гэта не толькі інвестыцыі ў навучанне ратавальнікаў. Напрыклад, у Брэсце быў пабудаваны Цэнтр бяспекі, праводзіцца рэканструкцыя будынка пажарнай аварыйна-выратавальнай часці, а былы штаб казармы рэканструюецца пад вучэбны цэнтр. Дзе-нідзе дзякуючы грантам закупляецца сучасная пажарная тэхніка і абсталяванне. Так, у 2019 годзе нашы ратавальнікі рэалізавалі агульных праектаў на сур'ёзную суму ў 14 мільёнаў еўра.



## Ратавальнікі на землятрусе

Імавернасць узнікнення буйнамаштабнай надзвычайнай сітуацыі існуе ў многіх пунктах зямнога шару. І справа зусім не ў тэхнагенных катастрофах, дзе не ў апошнюю чаргу вінаваты славуты чалавечы фактар. Раз-пораз у свеце здараюцца магутныя землятрусы. Усяго некалькі дзясяткаў хвілін падземных штуршкоў і ваганняў — і ў руіны могуць ператварыцца цэлыя гарады.

> **Гэтыя вучэнні ратавальнікаў найбольш статусныя з усіх, што праводзяцца ў Еўрапейскім саюзе, паколькі ўключаюць рэагаванне на надзвычайную трансмежную сітуацыю ў рэжыме рэальнага часу.**

Канешне, калі паглядзець на параўнальную карту эпіцэнтраў землятрасенняў, то Беларусь — адна з нямногіх краін свету, дзе яны ўвогуле не былі адзначаны як мінімум з 1963 года. Хоць хвалі да нас перыядычна дакочваюцца — згадаць хоць бы землятрусы ў Калінінградскай вобласці Расіі або ў Румыніі. Але 7 з 15 найбольш разбуральных землятрусаў у гісторыі чалавецтва адбыліся ў XX і XXI стагоддзі. А значыць, дапамога нашых ратавальнікаў можа спатрэбіцца ў любы момант. Ці гатовы яны да гэтага?

— Нашы ратавальнікі ўдзельнічалі ў буйнамаштабных вучэннях, якія праходзілі ў Даніі ў 2017 годзе, — згадвае Дзмітрый Ткачук. — Там адпрацоўваўся механізм грамадзянскай абароны Еўрапейскага саюза ў галіне пошукава-выратавальных работ. Заадно там праверылі на трываласць існуючую міжнародную каардынацыю.

Гэтыя вучэнні ратавальнікаў найбольш статусныя з усіх, што праводзяцца ў Еўрапейскім саюзе, паколькі ўключаюць рэагаванне на надзвычайную трансмежную сітуацыю ў рэжыме рэальнага часу. У адпаведнасці з легендай, Беларусь атрымала выклік аб дапамозе ад пацярпелага боку. Выратавальны атрад сабраўся ў Мінску на базе Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння. Пасля таго як было пагружана неабходнае абсталяванне і вызначаны неабходныя задачы, выратавальныя аўтамабілі паехалі ў Данію...

Крыху слоў пра перадгісторыю такіх вучэнняў. У 1980-я ў свеце адбыліся два вельмі разбуральныя землятрусы. У 1985 годзе падземныя штуршкі магнітудай 8.1 па шкале Рыхтэра скаланулі горад Мехіка. Тады пад абломкамі дамоў загінула каля 10 тысяч чалавек, яшчэ 30 тысяч атрымалі раненні. Сто тысяч засталіся без даху над галавой. Мінула тры гады — і яшчэ больш магутны Спітакскі землятрус накрыў паўночны захад тагачаснай Армянскай ССР. Там ужо колькасць загінулых складала 25 тысяч, а свайго жытла ў адзін момант пазбавіліся 514 тысяч чалавек...

— Менавіта тады сусветная супольнасць зразумела, што вельмі складана каардынаваць вялікую колькасць ратавальнікаў з усёй планеты, — працягвае Дзмітрый Ткачук. — А сама пацярпелая краіна фактычна знаходзіцца ў рэжыме надзвычайнага становішча і не можа аператыўна распрацаваць нейкі механізм, які б дазваляў рэгламентаваць, у якой зоне праводзіць работы, дзе знаходзіцца найбольш прыярытэтны напрамак, дзе можна размясціць базавы лагер і пасля ў парадку ратацыі праводзіць работы. Гэта прыводзіла да таго, што ў той жа Арменіі выратавальныя атрады некалькі разоў абследавалі незалежна адзін ад аднаго тыя ж самыя разбураныя будынкі. А ў гэты час, магчыма, хтосьці чакаў дапамогі пад заваламі наступнага дома і лік ішоў на хвіліны, каб яго выратаваць. З-за гэтага ўмовы працы былі максімальна набліжаны да рэалістычных. У тым ліку — і з пранікненнем унутр завалаў, а таксама выцягваннем адтуль пацярпелых, ролю якіх выконвалі статысты.

Разам з беларускімі ратавальнікамі ў тых вучэннях удзельнічалі атрады з Вялікабрытаніі і Францыі. Калі параўноўваць узровень працы, то наколькі ён адрозніваецца?

— Па аснашчанасці абсталяваннем нашы атрады і еўрапейскія знаходзяцца на супастаўным узроўні, — заўважае Дзмітрый Ткачук. — Мы можам выконваць аднолькавы спектр работ. Крыху адрозніваца могуць толькі методыкі — але гэта склалася гістарычна. Ды і тут розніца вельмі нязначная, і гэтыя варыяцыі маюць права на жыццё. Але ў чым нашы ратавальнікі дадуць фору, дык гэта ў згуртаванасці і натхнёнасці на выкананне пастаўленых задач.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
13 ЛЮТАГА 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 3 (15880)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# Георгій КАЛДУН: «Ніколі не лічыў сябе суперартыстам»



**Стаць удзельнікам маштабнага музычнага шоу, увайсці ў суперфінал, заваяваць любоў гледачоў і зорнага журы... Усё гэта ён здолеў зрабіць літаральна за некалькі месяцаў. Як заўсёды заставацца самім сабой і пры гэтым скараць сэрцы публікі, артыст расказаў журналісту «Чырвонкі. Чырвонай змены».**

***— Што падштурхнула да ўдзелу ва ўкраінскім «Х-фактары»?***

— У Беларусі, на жаль, не было нічога падобнага па маштабе. Я ведаў, што гэта цікавы праект, бачыў неаднаразова ў інтэрнэце, як усё выглядае. Да таго ж працаваў на ўкраінскім тэлеканале СТБ гадоў восем таму, вёў там праект «Феномен». Камандная работа, «карцінка», якая атрымліваецца, тэлевізійны прадакшн, прафесійны падыход — усё гэта мне вельмі імпанавала. Наогул, у мяне проста паўстала жаданне паўдзельнічаць. Цікавасць, якая ў выніку аказалася вельмі ўдалая.

***— Кажуць, у конкурсе самае «стомнае» — гэта кастынгі...***

— Гэта для мяне дастаткова эмацыянальная гісторыя, якая запатрабавала шмат сіл. Падчас кастынгаў я звычайна стараюся адысці кудынебудзь, каб засяродзіцца і эмацыянальна не «перагарэць». Што датычыцца менавіта праекта, туды я прыехаў раніцай, і ў прынцыпе тэарэтычна можна было б прастаяць там да вечара. Асабліва адыходзіць нікуды не дазваляюць, таму што можаш прапусціць сваю чаргу. Калі яна надыдзе, табе кажуць толькі перад самым выхадам, таму ўвесь час знаходзішся ў рэжыме чакання.

***— Ці была ўпэўненасць, што дакладна трапіце ў наступны этап?***

— Я ў роўнай ступені чакаў таго, што прайду, і таго, што не. Ніколі не лічыў сябе суперартыстам ці супервакалістам. Але пры ўсім гэтым разумею, што я не няздара. Бачу, што адбываецца вакол, гляджу тэлевізар, часам інтэрнэт, разумею, як людзі ўмеюць спяваць і як яны не ўмеюць гэтага рабіць. Апроч голасу як інструмента змагання існуе яшчэ маса іншых асабістых якасцяў, якія могуць уздзейнічаць на аўдыторыю. Тут ужо, як той казаў, як пашанцуе. У прынцыпе, быў гатовы да любога выніку.

***— З самага першага кастынгу жаночая палова журы ўвесь час рабіла вам кампліменты, і складана было не заўважыць, як вы бянтэжыцеся...***

— Такія пытанні задаяце... Як быццам у псіхатэрапеўта зараз знаходжуся *(смяецца)*. Я не люблю, а дакладней, не ведаю, як сябе паводзіць па-іншаму, калі хваляць. Тым больш калі хваляць доўга ці нейкія кампліменты робяць. А калі і на ўсю краіну... Ну, скажаш ты «дзякуй», а далей што рабіць, калі яны працягваюць? Для мяне бянтэжыцца ў такіх сітуацыях — прыкмета культуры.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

Камертон настрою

# КАБ ГАЛАСЫ ЗАГУЧАЛІ

## ...або 3 юных талентаў — у класікі...



**Як маладому аўтару выдаць сваю першую кнігу? Ці можа літаратура стаць прафесіяй? Як не прапусціць талент і даць шанц яму развіцца? Чаму літаратурная дзейнасць не заўсёды апраўдвае ўскладзеныя на яе чаканні? Гэтыя і многія іншыя пытанні аказаліся ў цэнтры ўвагі круглага стала «Развіццё маладой літаратуры: падтрымка юных талентаў у Беларусі», які прайшоў у прэс-цэнтры Дома прэсы.**

### ТОЛЬКІ ХОБІ?

— Па родзе сваёй дзейнасці мне часта даводзіцца браць удзел у рабоце розных міжнародных літаратурных конкурсаў, прэмій і фестываляў. Праз мяне праходзіць шмат твораў: паэзія, проза, драматургія, пераклады. І вось якую трывожную тэндэнцыю я заўважыў: колькасць прадстаўнікоў маладога пакалення ў гэтых мерапрыемствах — невялікая, больш таго, яна мае тэндэнцыю да змяншэння, — канстатуе **старшыня Беларускага літаратурнага саюза «Полоцкая ветвь» Алег ЗАЙЦАЎ.** — У трох пісьменніцкіх саюзах краіны моладзь займае невялікі працэнт, і гэта сведчыць аб тым, што ў вялікую літаратуру яна не вельмі спяшаецца, таму што статус пісьменніка на сённяшні дзень незразумелы і зарабіць мастацкім словам на жыццё, пракарміць сям'ю будзе даволі праблематычна. Таму мы, па меры сіл і магчымасцяў, падтрымліваем у нашым саюзе моладзь, хоць і не ствараем цяплічных умоў, каб яна адразу разумела, што пасля выдання першай кнігі ні слава, ні грошы на іх не абрынуцца. Давядзецца вельмі шмат працаваць, і не факт, што яны ўвогуле стануць вядомыя і ўвойдуць у вялікую літаратуру. Усе ведаюць, што ў кожным пакаленні ёсць сотні пісьменнікаў, але застаюцца ў падручніках з іх толькі адзінкі...

Сыходзяць людзі старэйшага пакалення, якія выраслі на іншых ідэалах, а на змену ім прыйшлі прагматыкі. Перспектывы ў пісьменніцтва туманныя, і моладзь выбірае іншыя кірункі дзейнасці для самарэалізацыі. Я лічу, што трэба на дзяржаўным узроўні вызначаць статус пісьменніка і ўбудоўваць яго ў сістэму сацыяльна-працоўных адносін — тады, напэўна, і моладзь па-іншаму будзе ставіцца да літаратарства. Літаратура перастане быць хобі, а стане асобнай прафесіяй!

Прывяду адзін прыклад. У 90-я гады, калі фарміраваўся наш саюз, больш за палову яго членаў складалі людзі ва ўзросце да 35 гадоў. Дастаткова сказаць, што старшыні было 40 гадоў, а двум яго намеснікам — па 26. Але эйфарыя прайшла, і праз дваццаць гадоў мы бачым, што змены няма. І з гэтым трэба штосьці рабіць...

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

Заняткі па душы

# БУДУАРНЫЯ І ШАРНІРНЫЯ,

## або Як ажывіць ляльку

**Таццяна КОСТУСЕВА па прафесіі інжынер-праграміст, працуе ў адной з паспяховых фірмаў па вырабе пластыкавай прадукцыі. Свабоднага часу ў гераіні не так многа, аднак калі ўсё ж з'яўляецца некалькі хвілін, яна думае аб... ляльках. Маладая рамесніца на працягу двух гадоў стварае прыгожыя цацкі для сябе і іншых і лічыць, што гэты занятак — на ўсё жыццё.**



— Творчасць суправаджала мяне з ранняга дзяцінства ва ўсякіх сваіх разнастайных формах, але больш за ўсё падабалася рабіць нешта сваімі рукамі. Аднак нельга сказаць, што бацькі мяне ў гэтым падтрымлівалі. Наадварот, лічылі, што мастак асуджаны на галечу, лепш засяродзіць увагу на нечым іншым. Таму паступіла ў Беларускі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі ў Гомелі і атрымала добрую спецыяльнасць, па якой цяпер і працую. Аднойчы, калі «шпацыравала» па прасторах інтэрнэту, знайшла інфармацыю пра лялькі — яны кранулі да глыбіні душы. Унутры нешта прачнулася, заварушылася, і я зразумела: мая творчая энергія, патэнцыял збіраліся доўгія гады, і прыйшоў час, каб іх рэалізаваць.

Таццяна лічыць, што такія задаткі ў яе ад сваякоў — дзядзька быў мастаком, увесь яго вясковы дом нагадваў карцінную галерэю. Ды і тата — на ўсе рукі майстар.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)***

# КАБ ГАЛАСЫ ЗАГУЧАЛІ

## ЗНАЙСЦІ І ПАДТРЫМАЦЬ

— А мы суправаджаем нашы юныя таленты ад першай іх публікацыі і да ўступлення ў Саюз пісьменнікаў, — падкрэслівае **старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі (СПБ) Міхась ПАЗНЯКОЎ.** — Сталыя, вопытныя празаікі і паэты з задавальненнем бяруць пад крыло пачаткоўцаў, якіх знаходзяць праз літаратурныя конкурсы, публікацыі ў розных выданнях, звароты ў выдавецтвы. Прасоўваем маладых пісьменнікаў праз пастаноўкі гарадскога тэатра паэзіі і іншыя літаратурныя імпрэзы.

Супольна з партнёрамі СПБ выдае калектыўныя зборнікі. У 2011 годзе была заснаваная кніжная серыя «Мінскія маладыя галасы». Цудоўна разумеем, што для маладых аўтараў вельмі востра стаіць пытанне з публікацыяй твораў. Каб стаць членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, трэба мець кнігі, а каб выдаць кнігу, асабліва ў дзяржаўным выдавецтве, трэба мець імя, каб забяспечыць тыраж. Атрымліваецца замкнёнае кола.

Упершыню сталічным аддзяленнем СПБ была падрыхтавана анталогія маладой паэзіі Беларусі «Мы — маладыя», дзе прадстаўлена 166 паэтаў (укладальнік Міхась Башлакоў). Маладым літаратарам (да 30 гадоў) штогод прысуджаецца літаратурная прэмія Мінскага гарадскога аддзялення СПБ «Адкрыццё года». З 2017 года заснаваны яшчэ тры літаратурныя прэміі ў намінацыях «Проза», «Паэзія» і «Дзіцячая літаратура».

Знайсці талент — палова справы, трэба яго яшчэ падтрымаць. Пры СПБ працуюць Школа юнага паэта і Школа юнага празаіка, дзейнічаюць творчыя секцыі, праводзяцца семінары для пачынаючых і маладых літаратараў. У сталіцы створана каля 40 літаратурных клубаў, студый і гасцёўняў для моладзі.

«А якія іскрынкі мы адкрываем!!! — хваліцца Міхась Пазнякоў. — Маладая паэтэса Кацярына Масэ... Першая яе кніжка выйшла, калі дзяўчына навучалася яшчэ ў восьмым класе мінскай школы. Цяпер яна ўжо скончыла Лінгвістычны ўніверсітэт, стала лаўрэатам некалькіх літаратурных прэмій. Калі ёй споўнілася 18 гадоў, прынесла дакументы ў Саюз пісьменнікаў Беларусі».

## ПРА ФОРМУ І ЗМЕСТ

— Кацярына Масэ двойчы, на чацвёртым і пятым курсах універсітэта, праходзіла перакладчыцкую практыку ў мастацка-літаратурным часопісе «Маладосць», а на дадзены момант вядзе ў нас аўтарскую рубрыку «Код паэзіі: узламаць нельга ўтойваць» і рэгулярна бярэ ўдзел у «маладосцеўскіх» імпрэзах, — расказвае **галоўны рэдактар часопіса Святлана ВОЦІНАВА.**

«Калі нехта ўрачыста заяўляе, што паэзія была прыдуманая, каб «выказваць чалавечыя эмоцыі», у мяне пачынае торгацца вока. Напэўна, калі зладзіць апытанку на прадмет задач паэзіі, гэты ўлюбёны ўсімі стэрэатып зойме першае месца сярод найбольш частых


Фота Грамадскага прэс-цэнтра Дома прэсы.

варыянтаў адказу. І як тут не прыгадаць Малармэ з яго ўжо хрэстаматыйным выказваннем: «Паэзія робіцца са слоў, а не з ідэй». З гэтага вынікаюць дзве важныя высновы. Па-першае, нельга «наліць» нейкую ідэю або пачуцце ў рытмізавана-рыфмаваную «пасудзіну» і назваць гэта паэзіяй, — разважае **маладая паэтэса і лінгвіст Кацярына МАСЭ.** — Таму што віно можа існаваць асобна ад келіха, як і келіх ад віна; ідэя можа існаваць асобна ад знака (хаця і не заўсёды), а вось змест ад формы і форма ад зместу ў вершы — пардон, ніяк. Добрая паэзія павінна прыпадабняцца тканіне ў бясшвовасці яе тэкстуры: як дзіця, дзівячыся гладкасці і непарыўнасці тканіны, не можа даць веры, што яна сатканая з тысяч асобных нітачак — кожная на сваім месцы, — так чытач мусіць дзівіцца цэльнакройнасці паэтычнага твора, не верачы, што ён складаецца з асобных гукаў і слоў. Калі суадносіць эталонную для мяне паэзію з пэўным відам тэкстылю, то гэта дакладна не пэчварк — не сабраная з дзясятка ўжо скарыстаных шматкоў коўдра. Добрая паэзія — гэта найтанчэйшы ядваб, пра які нездарма кажуць, што ён «сатканы з паветра», гэтак жа як верш найвышэйшага гатунку сатканы з цішыні».

## «КЕПСКІ ТЭКСТ — ГЭТА...»

— Уся наша штодзённая работа — гэта работа з моладдзю, — канстатуе Святлана Воцінава і засяроджвае ўвагу на новай канцэпцыі выдання: «Маладосць — больш чым часопіс». Апошняя прадугледжвае актыўнае супрацоўніцтва са студэнцкай аўдыторыяй для распаўсюджвання сярод яе інфармацыі пра магчымасці, створаныя «для тых, каму ёсць што сказаць свету». Цікавыя тэматычныя лекцыі і анкетаванні ў папяровым і электронным фарматах дазваляюць бліжэй знаёміцца з выданнем і смялей праяўляць сябе ў яго конкурсах і спецыяльных тэматычных праектах. Адсюль і заклік у анкеце, распрацаванай для студэнтаў: «Калі хочаш быць не толькі чытачом, але і суставальнікам часопіса...», і пытанні-прапановы, досыць неардынарныя, кшталту: «Уяві сябе галоўрэдам», або: «Кепскі тэкст — гэта...», або: «Ці існуюць для цябе тэмы-табу».

Літаральна днямі ў рамках XXVII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі былі падведзены вынікі ўжо II тура конкурсу біяграфічных твораў «Слаўная кампанія: рэANIMАцыя», прысвечаных беларускім пісьменнікам XIX стагоддзя. Ён ладзіцца рэдакцыяй часопіса «Маладосць» сумесна з філфакам БДУ пры інфармацыйнай падтрымцы Нацыянальнага інстытута адукацыі.

Гэта конкурс мастацкіх біяграфій пісьменнікаў XIX стагоддзя, скіраваны на папулярызацыю гісторыі айчыннай літаратуры. Конкурс адметны найперш тым, што можна выбраць любую персону. Сярод крытэрыяў ацэнкі — не толькі дакладнасць фактаў, праўдзівасць дэталяў эпохі і цэласнасць аповеду, але і займальнасць, арыгінальнасць, арыентаванасць на школьную і студэнцкую аўдыторыі.


Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

У другім туры на адрас арганізатараў паступілі 32 заяўкі. Узрост удзельнікаў вар'іраваўся ад 14 да 61 года. Сярод іх васьмікласніца, аспірант, маладая мама, прадстаўнікі навукова-даследчыцкай, культурнай і сацыяльнай сфер, перакладчыкі, журналісты, рэдактары друкаваных СМІ і інтэрнэт-рэсурсаў, выкладчыкі, студэнты-філолагі, студэнты-гісторыкі, студэнты-юрысты. Іншымі словамі, слаўная кампанія...

II тур конкурсу даў паўнавартасныя творы пра такіх пісьменнікаў XIX стагоддзя, як Франц Савіч, Уладзіслаў Сыракомля, Вайніслаў Савіч-Заблоцкі, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і Кастусь Каліноўскі. Найбольш папулярная аказалася асоба Кастуся Каліноўскага — на напісанне яго біяграфіі «замахнуліся» аж пяць канкурсантаў. На другім месцы — Франц Савіч (было чатыры заяўкі).

— У адказ на сваю заяўку (персону) кожны ўдзельнік атрымаў «ключы» — спіс крыніц у дапамогу, — кажа Святлана Воцінава. — У кожным летнім і восеньскім нумары часопіса «Маладосць» мы друкавалі артыкулы пад рубрыкай «У падтрымку». Да таго ж усе мелі права звяртацца да арганізатараў па любую дапамогу — ад кансультацый да папярэдняга прачытання твора.

Святлана Воцінава анансавала новы конкурс краязнаўчых сачыненняў для школьнікаў, палажэнне аб якім цяпер распрацоўваецца разам з Нацыянальным інстытутам адукацыі, і заклікала далучацца да Рэспубліканскага конкурсу літаратурнай творчасці студэнтаў ВНУ «Аўтограф-2020», прысвечанага 75-й гадавіне Вялікай Перамогі і Году малой радзімы. Ён стартаваў у студзені.

## ВЫРАСЛІ НА «КЛУМБЕ»

**Кацярына РОЎДА** — яшчэ адзін **малады член Саюза пісьменнікаў Беларусі** (пісаць пачала ў 16 гадоў), паэтэса, кіраўнік клуба аматараў мастацкага слова «КЛУмБА» пры БДУ. У 2014 годзе сярод студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта прайшоў літаратурны конкурс «Славянскі калейдаскоп», які атрымаў нечаканы працяг. На першым сходзе паэт Міхась Пазнякоў уручыў маладым калегам часопісы «Белая вежа», дзе ўпершыню публікаваліся іх творы, — так пачаткоўцы атрымалі зваротную сувязь, і карані будучага творчага аб'яднання пачалі расці ўглыб. А вядомы пісьменнік стаў яго «хросным бацькам».

Кацярына падкрэслівае, як важна натхняцца супольнымі інтарэсамі. Гэта яна называе цеплаабменам. Для сучаснай маладой літаратуры, яе поспехаў і перспектыў важна ўсё: яна — як маладая раслінка, якой патрэбны цеплыня, святло, клопат і захапленне.

Сёння пераважная большасць «клумбаўцаў» спрабуе свае сілы ў вершах і прозе, тым не менш гэта не проста літаратурнае аб'яднанне, якім мы звычайна яго ўяўляем. Яго дзверы адчынены для тых, хто проста любіць мастацкае слова, спявае, чытае вершы, выступае ў ролі вядучых літаратурна-музычных вечарын, ладзіць творчыя конкурсы, а то і проста прыходзіць на сустрэчы і імпрэзы, каб паслухаць і падтрымаць сваіх сяброў-аднагодкаў. Людзей прываблівае тое, што «КЛУмБА» ладзіць мерапрыемствы па-за межамі ўніверсітэта: прэзентацыі, віктарыны, сумесныя паездкі, паходы, паэтычныя сустрэчы, выступленні...

Усе задумы рэалізуюцца па прынцыпе «захацеў, абмеркаваў, ажыццявіў». Нехта прыдумляе канцэпцыю, астатнія дапамагаюць яе ўдасканаліць і ажыццявіць. Творчыя пошукі моладзі ўвасабляюцца ў розных фарматах. Так, напрыклад, нарадзіўся аўтарскі спектакль «Пасля ўсяго», прысвечаны Ганне Ахматавай, імпрэза паводле творчасці Бэлы Ахмадулінай.

Многія «клумбаўцы» ўжо сталі пераможцамі рэспубліканскіх і міжнародных літаратурных прэмій і маюць свае літаратурныя зборнікі. Сёння калектыў працуе над новым праектам — альманахам «аБДУмана». Выданне будзе створана, каб паспрабаваць свае сілы не толькі ў якасці аўтараў, але і ў карэктарска-выдавецкай рабоце. На яго старонках з'явяцца вершы, проза, калумністыка і пераклады ўдзельнікаў аб'яднання і аўтараў-пачаткоўцаў з розных факультэтаў БДУ. Нездарма абрэвіятура была ўплецена ў назву альманаха.

— Наша моладзь — вельмі таленавітая. Так, часам не хапае фінансавай падтрымкі, іншы раз — не хапае ўпэўненасці. Чалавек піша ў стол, а ён можа быць нашмат больш таленавіты, чым той, хто піярыць сябе ў інтэрнэце, — разважае Кацярына Роўда. — І мне вельмі хочацца, каб наша творчая моладзь як мага часцей выходзіла з рэжыму анлайн, хочацца жывых сустрэч з пісьменнікамі і паэтамі, больш жывой літаратуры.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

*Не вучобай адзінай*



# «ДАПАМАГАЦЬ ЛЮДЗЯМ — ГЭТА КРУТА!»

**Жыццё валанцёраў вельмі яркае і насычанае. Літаральна кожны дзень яны здзяйсняюць добрыя ўчынкі, дапамагаюць дарослым і дзецям. Кожны з іх заслугоўвае таго, каб пра яго даведаліся. Менавіта для гэтага штогод БРСМ праводзіць конкурс «Валанцёр года». Адной з пераможцаў у намінацыі «Асабісты ўнёсак 2019 года сярод студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі» стала студэнтка чацвёртага курса факультэта дашкольнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Віялета АЛЯШКЕВІЧ.**

— Валанцёрствам я пачала займацца яшчэ ў школе, з восьмага-дзявятага класа. Педагог-арганізатар прапанавала, я зацікавілася і паспрабавала. Першым вопытам стаў удзел у навагоднім канцэрце для дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Потым мяне гэта справа захапіла. Стала сама цікавіцца валанцёрскім рухам: наведваць ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, пажылых людзей і проста ўдзельнічаць у розных акцыях. Напрыклад, раздавала ўлёткі аб правілах паводзін на чыгунцы, — прыгадала дзяўчына.

Пасля школы Віялета паступіла ва ўніверсітэт, але дапамагаць людзям не перастала. З першага курса запісалася ў валанцёрскі клуб ВНУ «Добрае сэрца». Стала наведваць дзіцячыя інтэрнаты і сацыяльна-педагагічныя цэнтры, бальніцы, дамы для пажылых людзей.

— Часам, рыхтуючыся да чарговага майстар-класа, магу ўсю ноч заліваць гіпсавыя фігуркі ці майстраваць кветкі, якія дзеці будуць потым размалёўваць. Цяпер рэалізую ўласны праект «Найлепшы сябар» з выхаванцамі сацыяльна-педагагічнага і анкалагічнага цэнтраў. Валанцёрства займае амаль увесь вольны час, таму рэдка бачуся з сябрамі, ды і дадому ў Асіповічы прыязджаю нячаста. Па мне, вядома, сумуюць... Але я нічога з сабой зрабіць не магу — мне падабаецца дапамагаць людзям, гэта ж крута!

Мінулым летам Віялета адкрыла для сябе спартыўны кірунак і стала лідарам групы валанцёраў на II Еўрапейскіх гульнях. Дзяўчына каардынавала работу каманды колькасцю больш за дваццаць чалавек

— У мяне была вельмі адказная работа. Дзякуючы свайму кіраўніку Алене Кузьміной, хлопцам і дзяўчатам з каманды я стала больш камунікабельная і мэтанакіраваная. Праводзіла круглыя суткі на стадыёне «Дынама», затое набыла шмат новых сяброў, а таксама бясцэнны вопыт. Цяпер працягваю займацца спартыўным валанцёрствам.

Адзінай складанасцю, якая ўзнікае ў жыцці валанцёра, дзяўчына называе нежаданне дзяцей адпускаць яе. А такія сітуацыі ўзнікаюць досыць часта:

«Яны вельмі хутка прывыкаюць да нас, адчуваюць, што мы іх не шкадуем, а размаўляем на роўных».

У конкурсе «Валанцёр года — 2019» студэнтцы прапанавалі паўдзельнічаць куратары валанцёрскага клуба. Для яго Віялета рабіла відэаролік і прэзентацыю аб сваёй дзейнасці. А потым заставалася толькі чакаць абвяшчэння вынікаў.

**Ангеліна НОВІКАВА,**
**студэнтка III курса**
**Беларускага дзяржаўнага**
**ўніверсітэта культуры**
**і мастацтваў.**

*Насустрач часу*

# Адзначыць свята ў... бібліятэцы

## У яе «гучнай» зоне

**Як адпавядаць рэаліям інфармацыйнага грамадства, павысіць у чатыры разы наведвальнасць і запатрабаванасць універсітэцкай бібліятэкі, ведаюць у БДУ.**

### Традыцыі і інавацыі

— У ёй павінна быць жыццё, — сцвярджае **дырэктар Фундаментальнай бібліятэкі БДУ Уладзімір КУЛАЖАНКА,** разважаючы пра месца і задачы ўстановы ў лічбавым асяроддзі. — Гістарычна так склалася, што яна з'яўляецца месцам «ціхіх» заняткаў. Мы ж паспрабавалі адысці ад стандартнага падыходу і стварыць атмасферу ўзаемадзеяння і камунікацыі. Дазволілі нашым студэнтам тут стасункавацца.

Інфармацыя сыходзіць у лічбавую прастору, а разам з ёй і студэнт «апускаецца» ў гаджэт. Мы сталі прадумваць шляхі вяртання моладзі ў чытацкае асяроддзе. Выснова была адна — гэта можна зрабіць праз стварэнне ўнікальнай пляцоўкі, дзе ёсць традыцыі і інавацыі.

**«Студэнтам патрабуецца крэатыўная прастора. Усё павінна спрыяць раскрыццю іх творчых асоб».**



Сёння БДУ мае адну з найлепшых у свеце электронных бібліятэк. Згодна з міжнародным рэйтынгам Transparent Ranking of Repositories, яна займае трэцяе месца сярод універсітэцкіх бібліятэк і дванаццатае — у сусветным топ-лісце. Сярод айчынных ВНУ БДУ мае найбольш поўную падпіску на навуковыя электронныя рэсурсы і забяспечвае доступ да больш чым 30 рэферативных і паўнатэкставых баз даных, такіх як Scopus, Web of Science, SpringerLink, ScienceDirect, EBSCO і іншыя. Тут размяшчаюцца найбольш аўтарытэтныя публікацыі навукоўцаў з усяго свету. Кожны студэнт і супрацоўнік БДУ абсалютна бясплатна можа пазнаёміцца з самымі ўплывовымі даследаваннямі сусветнага ўзроўню.

— Такім чынам, для нашых карыстальнікаў мы прывабныя сваім эксклюзівам і перавагай перад сусветнай павуцінай. Бо многія даступныя ў БДУ інфармацыйныя крыніцы закрытыя для карыстальнікаў у інтэрнэце, — падкрэслівае Уладзімір Кулажанка. — Акрамя таго, супрацоўнікі бібліятэкі кансультуюць акадэмічны персанал універсітэта па пытаннях публікацыйнай актыўнасці, фарміравання лічбавага партфоліа вучонага, а таксама эфектыўнага лічбавага прасоўвання вынікаў навуковай дзейнасці.



### Ад віртуальнасці да рэальнасці

У БДУ ролю цэнтра бібліятэкі выконвае навуковая зала ў галоўным корпусе ВНУ. Гэта найбуйнейшы адкрыты фонд спецыялізаванай літаратуры ў Беларусі. У свабодным доступе тут знаходзіцца больш за 65 тысяч паасобнікаў розных выданняў і перыёдыкі.

— Перад кіраўніцтвам бібліятэкі стаяла вялізная задача — «прыручыць» студэнта. Рашэнню спрыяў і рамонт, завершаны ў чытальнай зале ў канцы 2018 года. Важным было не толькі абнаўленне сцен, падлогі і вокнаў. Трэба было паіншаму арганізаваць прастору з улікам менталітэту і патрэб сучаснага студэнта, — дзеліцца сакрэтамі кіраўнік Фундаментальнай бібліятэкі.

Над новым вобразам навуковай залы працавалі запрошаныя дызайнеры факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ. Яны прапанавалі колеравае афармленне і выкарыстанне ў якасці дэкору сцен студэнцкіх мастацкіх работ.

Галоўным наваўвядзеннем стала дзяленне прасторы залы на зоны рознай актыўнасці. Так утварыліся «гучная» пляцоўка для настольных гульняў, стасункаў, работы над навучальнымі або грамадскімі праектамі, стартап-ідэямі і «ціхія» месцы — для падрыхтоўкі да заняткаў, вывучэння літаратуры. Навуковая зала пасля рамонту павялічылася да 70 пасадачных месцаў. На іх устаноўлены камп'ютары, забяспечаны доступ да бесправаднога інтэрнэту.

### Да 500 наведвальнікаў у дзень

— Мы імкнёмся ствараць камфортныя ўмовы на любым этапе наведвання бібліятэкі і задавольваць любы запыт нашых чытачоў. Студэнтам патрабуецца крэатыўная прастора. Усё павінна спрыяць раскрыццю іх творчых асоб і патэнцыялу, — упэўнены дырэктар. — У Фундаментальнай бібліятэцы ёсць уся неабходная інфраструктура: інтэрнэт, друкарскі цэнтр, 3D-прынтар — фактычна функцыянал каворкінга.

Гэтае ўнікальнае асяроддзе стала магнітам для студэнтаў і выкладчыкаў. За апошні год колькасць наведвальнікаў толькі ў навуковай зале вырасла да 500 чалавек у дзень, што ў чатыры разы перавышае паказчыкі папярэдніх гадоў.

**Даведка**

Фундаментальная бібліятэка БДУ заснавана 23 мая 1921 года. У верасні 1922 года пастановай Саўнаркама БССР пераўтворана ў Беларускую дзяржаўную і ўніверсітэцкую бібліятэку. У 1926 годзе было прынята рашэнне аб вылучэнні Дзяржаўнай бібліятэкі (цяпер Нацыянальнай бібліятэкі) са складу БДУ. Фундаментальная бібліятэка працягнула сваю работу як універсітэцкая.

Цяпер фонд айчыннай і замежнай літаратуры складае каля двух мільёнаў дакументаў. Да паслуг чытачоў 15 інфармацыйных залаў, размешчаных у дзесяці карпусах універсітэта. Штогод фіксуецца больш за 1,3 мільёна зваротаў да інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі.

### Стратэгія: «кліент заўсёды мае рацыю»

— Шматгадовая работа Фундаментальнай бібліятэкі БДУ даказвае, што лічбавыя тэхналогіі не выцясняюць класічныя, а спрыяюць якаснай змене бібліятэчных паслуг, паляпшэнню камунікацыі паміж персаналам і чытачамі. Выконваючы традыцыйную функцыю інфармацыйнага забеспячэння навучальнага працэсу, бібліятэка адпавядае актуальным запытам чытачоў, актыўна кантактуе з імі, у тым ліку ў віртуальным асяроддзі, — кажа Уладзімір Кулажанка.

Па словах кіраўніка, бібліятэка, з пункту гледжання маркетынгу, такая ж арганізацыя абслугоўвання, як кавярня або крама, і тут варта выкарыстоўваць тыя ж прынцыпы і падыходы. «Магчыма, гэта не заўсёды адпавядае менталітэту некаторых бібліятэкараў, але для нас прынцыповая пазіцыя — выключна ветлівае стаўленне да карыстальнікаў, нават калі часам яны заходзяць у куртках ці з заплечнікамі. У нас дзейнічае залатое правіла абслугоўвання — «кліент заўсёды мае рацыю». «Усе ініцыятывы па паляпшэнні работы, якія з'яўляюцца ў бібліятэцы, зыходзяць ад нашых супрацоўнікаў. Яны ўкладваюць усіх сябе, ахвяруюць вольным часам, імкнучыся стварыць атмасферу хатняй утульнасці, нават частуюць студэнтаў хатнім печывам, цукеркамі, гатуюць чорную і травяную лекавую гарбату. У «гучнай» зоне ёсць бойлер для нагрэву вады, мікрахвалевая печ. Так утварыўся «фуд-корт», дзе кожны ахвотны можа прыгатаваць гарбату, каву ці разагрэць ежу, — расказвае дырэктар. — Цяпер я назіраю, як моладзь праводзіць на нашай пляцоўцы дні нараджэння ці іншыя значныя святы. І гэта вельмі радуе. Ёсць адчуванне задавальнення, спакою і даверу з боку студэнтаў. Гэта дарагога варта».

**Паліна ДАЎГІЛЕНКА.**
**Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА.**

*Алгарытм поспеху*

# Навучыць чуць і бачыць

**Артур ЦАРЫКОВІЧ, вучань 11 класа слуцкай сярэдняй школы № 11, усур'ёз цікавіцца праграмаваннем і тэмай інклюзіі. Ён распрацаваў мабільную праграму для ўзаемадзеяння з глуханямымі або нямымі Contact.**

— Сутнасць распрацоўкі ў тым, каб пры дапамозе камеры мабільнага тэлефона навучыцца распазнаваць індывідуальныя жэсты людзей з інваліднасцю, — расказвае Артур. — Каб пачаць работу з праграмай, спачатку трэба спампаваць яе ў Play Market (пакуль што яна даступна толькі на Android, але ў найбліжэйшы час будзе распрацавана і для iOS), запусціць і сфатаграфаваць жэсты суразмоўніка пры дапамозе пальчаткі чырвонага колеру. Здымкі адпраўляцца ў базу даных, распазнаюцца пэўнымі алгарытмамі, і праз некалькі секундаў прагучыць гукавы адказ. Чырвоная пальчатка патрэбна для таго, каб праграма адсейвала лішнія колеры. Надзяваць яе трэба на левую руку, бо з правай могуць атрымлівацца іншыя вынікі распазнавання жэстаў, — расказаў юнак.

Артур стварыў дзесяць базавых класаў асноўных жэстаў па пяць тысяч ілюстрацый у кожным. Хлопец кажа, што надалей іх можна пашыраць на колькі заўгодна адзінак.

— Ідэя стварэння менавіта інклюзіўнай распрацоўкі ўзнікла летась. Гэтаму паспрыяў удзел у рэспубліканскім сацыяльна-



адукацыйным праекце А-1 YOUTH («Ідзі, якія змяняюць свет да лепшага»), дзе я прадставіў праект у сферы фізікі. Да таго ж з ім выступіў на маштабнай маладзёжнай канферэнцыі TEDxYouth@Minsk.

Там Артур у ліку дзесяці фіналістаў падзяліўся вопытам рэалізацыі мабільнай праграмы Phone Paint Detector, створанай для таго, каб распазнаваць і даваць інфармацыю пра творы выяўленчага мастацтва.

— У многіх карцінных галерэях і музеях наведвальнікам прапануюць аўдыягіды для больш падрабязнага вывучэння работ. Але такі сродак не заўсёды практычны, бо аўдыёсістэма абыходзіцца ўстанове і наведвальніку дорага, яна можа зламацца, часта перашкаджае тым, хто знаходзіцца побач. Праграма ж, якая была створана мной і маёй аднакласніцай Анастасіяй Крыўленяй, бясплатная і простая ў выкарыстанні. Яна не займае памяць тэлефона і дазваляе распазнаваць карціны на вялікай адлегласці, акрамя таго, працуе ў рэжымах анлайн і афлайн. Усё, што трэба зрабіць, — гэта спампаваць разумны гід на тэлефон, пасля карыстальніку трэба будзе націснуць на адну кнопку — і пачнецца распазнаванне. Ён сфатаграфуе карціну, адправіць на сервер, а далей атрымае ўсю інфармацыю пра шэдэўр у лічаныя хвіліны. Дарэчы, праграма актыўная, нават калі карціна пашкоджана на 30 працэнтаў, — тлумачыць адзін з аўтараў.

За сваю распрацоўку школьнікі атрымалі дыплом III ступені на XV Балтыйскім навукова-інжынерным конкурсе. А за стварэнне інклюзіўнай праграмы Артур быў узнагароджаны дыпломам I ступені на XXII конкурсе работ даследчага характару вучняў школ Мінскай вобласці.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

*Нябачныя масты*

# МАЛАДЫМ І КАРТЫ Ў РУКІ

**БРСМ і Еўрапейская асацыяцыя маладзёжных карт (ЕYCA) падпісалі ліцэнзійны дагавор аб супрацоўніцтве. Адбылося гэта ў Рэспубліканскім доме моладзі падчас візіту ў нашу краіну дэлегацыі ЕYCA на чале з дырэктарам Манэлам Санчасам.**

Як адзначыў першы сакратар ЦК БРСМ Дзмітрый ВАРАНЮК, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі на працягу многіх гадоў выбудоўвае стасункі з Еўрапейскай асацыяцыяй маладзёжных карт: «Мы падпісалі ліцэнзійны дагавор і сталі афіцыйнымі членамі велізарнай сям'і. Самы галоўны вынік гэтай ініцыятывы — тое, што мы зможам адкрыць Беларусь для ўсёй Еўропы».

Пагадненне дазволіць наўпрост працаваць па ключавых пытаннях падтрымкі моладзі. Яно будзе спрыяць рэалізацыі самых розных сусветных і еўрапейскіх студэнцкіх ініцыятыў. Уладальнікі маладзёжных карт змогуць удзельнічаць у розных праектах і праграмах, якія прапануе ЕYCA. З іх дапамогай любы малады еўрапеец зможа адкрыць для сябе Беларусь, даведацца пра нашу сістэму адукацыі, падтрымку маладзёжнага прадпрымальніцтва і навуковай моладзі.

Манэл Санчас, дырэктар Еўрапейскай асацыяцыі маладзёжных карт, адзначыў, што ў Беларусі вельмі шмат хлопцаў і дзяўчат з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. «Гэта адна з падстаў, чаму ЕYCA хоча супрацоўнічаць з Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі. Мы вялі перагаворы аб тым, як будуць развівацца нашы адносіны. Зробім акцэнт на акадэмічную мабільнасць: моладзь будзе прыязджаць з Еўропы ў Беларусь і наадварот. Будзе рэалізоўвацца розныя праграмы і семінары. Спадзяюся, што гэтае супрацоўніцтва прыўнясе ў развіццё нашай асацыяцыі нешта новае і будзе карысная для абодвух бакоў», — дадаў Санчас.

Еўрапейская асацыяцыя маладзёжных карт (ЕYCA) была створана ў 1987 годзе. У далейшым ідэя стварэння дысконтнай сістэмы для падтрымання цікавасці моладзі да вывучэння культуры іншых краін і падарожжаў актыўна развівалася.

Максімальны ўзрост уладальніка еўрапейскай маладзёжнай карты быў павялічаны з 26 гадоў да 30, а колькасць краін, якія ўдзельнічаюць у гэтай праграме, за ўвесь час яе існавання вырасла з 7 да 36. У кожнай з краін Еўропы, дзе дзейнічае карта, права яе выпускаць мае толькі адна нацыянальная арганізацыя, якая падтрымліваецца дзяржаўнымі органамі і ўваходзіць у Еўрапейскую асацыяцыю маладзёжных карт. Карта сапраўдная ва ўсіх дзяржавах-удзельніцах, а ў некаторых з іх з'яўляецца пасведчаннем асобы і нават бясплатным праязным дакументам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# БУДУАРНЫЯ І ШАРНІРНЫЯ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

— Я чэрпала патрэбную інфармацыю з сеціва або даведвалася ад іншых захопленых. Чытала, як робяць лялькі, не выходзячы з дому, і загарэлася ідэяй таксама іх стварыць. Галоўнае, каб родныя не былі супраць эксперыментаў, у тым ліку з выкарыстаннем розных хімічных рэчываў. Увесь працэс пачынаецца з выбару матэрыялу. Для будуарных лялек я выбрала палімерную гліну — яна добра падыходзіць, таму што па сваіх уласцівасцях падобная на пластылін. Гэтую гліну трэба выпякаць у печы. Часам муж заходзіць дадому са словамі: «О, нешта смачнае гатуецца... А-а-а, зноў там твае галовы» *(усміхаецца)*. Калі дэталі зроблены, ідзе іх шліфоўка, потым падрыхтоўка да роспісу, пакрыццё спецыяльным поліўрэтанавым лакам, а пасля — размалёўка частак цела: дзесьці акрылам, дзесьці — акварэллю. І зноў пакрыццё лакам. Калі ўсё гатова, пераходжу да збору лялькі. У нагах і тулаве — шплінты (гнуткія мацаванні). Дзякуючы ім вырабы атрымліваюцца вельмі пластычныя, быццам жывыя.

На ляльках гераіні відаць усе чалавечыя асаблівасці: радзімкі, вяснушкі або невялікія маршчынкі. Менавіта гэта і прыцягвае да цацак. Што цікава, валасы на іх — гэта казіная шэрсць, яе дасылаюць з Расіі, дзе знаёмая суразмоўніцы займаецца развядзеннем гэтых жывёл і прадае незвычайную сыравіну лялечнікам. Тацняна прыводзіць яе ў патрэбны выгляд: расчэсвае, абстрыгае як трэба і фарбуе, мацуе на магніты да галавы.

— На стварэнне будуарнай лялькі траціцца месяц-два. Хутчэй за ўсё, напачатку давядзецца састваць шмат матэрыялу: я захоўваю дома пакет з непатрэбнымі дэталямі — гэта мая памяць і вопыт. Паняцце «лялечнік» аб'ядноўвае шмат навыкаў з розных прафесій. Гэта і мастак (суразмоўніца на некаторых цацках выкарыстоўвае роспіс хной — мехендзі), і скульптар, і дызайнер (моднае адзенне гераіня стварае цалкам самастойна), і механік. А яшчэ... урач. Каб правільна размаляваць прапорцыі цела, трэба ведаць чалавечую анатомію.

Самыя папулярныя лялькі ў калекцыі — шарнірныя. Яны могуць прымаць любыя чалавечыя позы.

— На стварэнне менавіта такой адной можа пайсці да года, яны вельмі далікатныя ў рабоце. Лепшая майстар-мадэль, з якой пасля здымаюцца формы для вырабу копій-адлівак з дапамогай розных тэхналогій. На працягу месяца ствараюцца і формы для розных дэталяў. З імі таксама трэба шмат працаваць — перарабляць, падганяць. Праходзіць некалькі папярэдніх зборак, перш чым усе яны ідэальна стануць на свае месцы. Далей — размалёўка. Гэта той момант, калі лялька «ажывае» і ўжо глядзіць на вас маленькімі вочкамі. Апошні этап — зборка, адзенне і замацаванне парыка. Кожнаму творцу знаёмыя душэўныя пакуты: сёння атрымалася добра — адчуваеш сябе таленавітай, назаўтра нічога не выходзіць — я няздара, — кажа гераіня.

Суразмоўніца ўдзячная сваім цацкам за тое, што яны адкрылі ёй новы свет з цікавымі людзьмі:









«Калі мы з імі сустракаемся, прысутнія звычайна нас запамінаюць, бо ўсе сталі хутка пертвараюцца ў выставку нашых работ. Ды і самі перыядычна іх арганізоўваем у горадзе».

Таня расказала, што працаваць над лялькамі ёй значна лягчэй начамі. Тут важна выконваць толькі адно правіла — не садзіцца за справу без добрага настрою.

— Гэта чароўны час, калі ўся сям'я ўжо спіць, ніхто не перашкаджае напоўніцу атрымліваць асалоду ад працэсу. Калі ёсць жаданне нешта ўвасобіць, магу займацца гэтым суткамі. Але пасля абавязкова патрэбны перапынак на тыдзень ці месяц. Стварэнне цацак магу параўнаць з нараджэннем дзіцяці: ніколі не адгадаеш, які ў яго будзе характар, але дакладна ведаеш, што будзеш яго любіць. У кожнай — пэўныя эмоцыі, у некаторых ёсць імя. Часам лялькам не падабаюцца сукенкі, якія я пашыла для іх, колер валасоў і гэтак далей. Гляджу і разумею: трэба нешта іншае, таму імкнуся «дагадзіць» сваім цацкам, — ці то жартам, ці то ўсур'ёз кажа Таццяна. — Усе яны ствараюцца ў адзіным экзэмпляры, некаторыя з іх — пад уплывам натхнення ад кнігі ці фільма. Ёсць немаўляткі, прынцэсы, дарослыя дамы, а вось хлопчыкаў пакуль што няма.

Рамесніца прызнаецца: напачатку захапленне лялькамі ніякіх планаў наконт заробку яна не рабіла, бо ў першую чаргу была мэта стварыць, а не прадаваць. Аднак цяпер перадаваць прыгажосць, нават у добрыя рукі, танна не можа — пакупнік павінен разумець яе каштоўнасць, тое, колькі сіл, часу было ўкладзена.

— У глыбіні душы хацелася б, каб хобі стала маёй асноўнай работай, але пакуль што гэта толькі мары. Цяпер такая справа найперш для душы. Прыемна бачыць, што мае лялькі выклікаюць цікавасць у розной аўдыторыі. У планах — пачаць рабіць цацкі з фарфору. Гэта складана і затратна, але ў той жа час вельмі прыгожа. Дарэчы, да крытыкі адносна свайго захаплення стаўлюся станоўча, бо галоўнае, каб творчасць выклікала эмоцыі ў чалавека.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

*Мінск — Гомель — Мінск.*

**Фота з архіва гераіні.**

*«Звязда» працягвае друкаваць матэрыялы ў падтрымку адкрыцця ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна музея, прысвечанага творчасці Алеся Адамовіча*

ГЛУША Адамовіча

# Актывістам быць модна,

## або Што трэба для таго, каб рэалізоўваліся нават самыя дзёрзкія па сваёй смеласці праекты

**Так атрымалася, што справа са стварэннем музея ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна зацягнулася на нявызначаны час. Затое мы сталі сведкамі таго, як за зусім невялікі перыяд адзін звычайны чалавек — не бізнесмен, не чыноўнік, не кіраўнік нейкага прадпрыемства — змог зрабіць для ўвекавечання памяці Алеся Адамовіча так многа.**

Мы ўвесь час назіралі (і пісалі), з якім імпэтам і натхненнем бабруйскі хлопец **Андрусь АРХІПЕНКА** займаўся пошукам сродкаў на помнік Алеся Адамовіча ў Глушы, як ён удзельнічаў у краўдфандынгавых кампаніях, слаў лісты ва ўсе канцы свету да вядомых людзей з заклікам падтрымаць праект. Як вынік, за апошнія два гады ў Глушы з'явіўся не толькі бюст пісьменніка, але яшчэ і арт-прыпынак з фотапартрэтам Адамовіча і словамі з яго апошняга твора. Актыўнасць Андрэя паспрыяла таму, што вакол яго ўтварылася цэлая суполка, ініцыятыўная група, якая дапамагла ўсе гэтыя праекты рэалізаваць. Прэцэдэнт у маштабах вобласці даволі рэдкі, асабліва, што датычыцца раёнаў. Нездарма магілёўскі Цэнтр гарадскіх ініцыятыў азначыў Андруся і яго каманду спецыяльнай прэміяй — «Пра рэгіён».

— Мы выбралі праект па Глушы таму, што ён вельмі важны для Магілёўскай вобласці, — адзначыў **кіраўнік** гэтай арганізацыі **Юрый СТУКАЛАЎ.** — Гэта вельмі добры прыклад, калі каманда аднадумцаў, простых людзей можа сваім энтузіязмам ушанаваць памяць такога значнага для нашай гісторыі чалавека. Гэта прэмія ў вобласці грамадскага актывізму наогул уручаецца ўпершыню. Мы яе вырашылі заснаваць Цэнтрам гарадскіх ініцыятыў, каб надаць грамадскаму актывізму больш высокі статус. Каб жыхары горада і вобласці бачылі, што актывістам быць модна, крута. Каб такія прыклады натхнялі іншых і часцей знаходзіліся жадаючыя рабіць лепш не толькі для сябе самога, але і для ўсяго грамадства.



Праект па ўстаноўцы бюста Алеся Адамовіча ў Глушы грамадскасць прызнала найлепшым у намінацыі «Партнёрства года».

Прынамсі, на ўзроўні раённаў такога праекта дагэтуль яшчэ не было. З Андрэем мы пазнаёміліся падчас семінара ад нашай школы «Цяпліца» ў Бабруйску два гады таму, і ён адразу ж звярнуў на сябе ўвагу сваёй мэтанакіраванасцю. Мы нават дапамаглі яму адшліфаваць ідэю праекта па арт-аб'екце «Прыпынак Адамовіча».

Яшчэ адна грамадская арганізацыя ўручыла камандзе прэмію ў намінацыі «Партнёрства года». Стварэнне помніка пісьменніку ў Глушы было ацэнена як яскравы прыклад прыватна-дзяржаўнага супрацоўніцтва. Разам з іншымі была адзначана і **былая старшыня Глушанскага сельскага Савета Марыя СУШЧАНКА,** якая дапамагла бабруйскім актывістам рэалізаваць праект. Пад яе кіраўніцтвам праводзілася добраўпарадкаванне тэрыторыі пад устаноўку помніка, высаджваліся туі. Марыя Сушчанка заўсёды з павагай ставілася да славутага земляка і рабіла ўсё для таго, каб і жыхары не забываліся, што іх з Адамовічам звязвае малая радзіма. Менавіта дзякуючы пісьменніку Глуша стала вядомай на ўвесь свет, а гэта, у сваю чаргу, абавязвае трымаць статус. За амаль 13 гадоў знаходжання на пасадзе старшыні яна сем разоў выводзіла сельсавет у лідары на ўзроўні раёна і па два разы — на абласным і рэспубліканскім узроўнях.

Дзесяць гадоў таму, дзякуючы яе перамозе ў конкурсе міжнародных праектаў, было створана свята вёскі — фестываль творчасці і рамёстваў «Глушанскі хутарок». Гэты фестываль цяпер набыў статус раённага. Пазалетась падчас яго і былі прэзентаваны арт-прыпынак у гонар вядомага земляка. Мы ўжо пісалі, як шмат намаганняў Марыя Сушчанка прыкладала для таго, каб у Глушы з'явіўся музей Алеся Адамовіча. Будынак легендарнай аптэкі — асноўнае месца дзеяння ў творах пісьменніка, захаваўся не без яе стараннаў. Гэты дом знаходзіцца побач з сельсаветам і заўсёды быў, як той казаў, пад наглядам. Будынак у цяжкім стане, але ён — жывая гісторыя. І вельмі важна захаваць яго для нашчадкаў. Прыклад супрацоўніцтва Глушанскага сельсавета з прыватнай ініцыятывай на карысць пасёлка яшчэ раз пацвердзіў — разам можна вырашыць нават самыя, здавалася б, неверагодныя задумкі.




Магілёўскі Цэнтр гарадскіх ініцыятыў ацаніў актыўнасць ініцыятыўнай групы па ўвекавечанні памяці Алеся Адамовіча спецыяльнай прэміяй «Пра рэгіён».

— Марыя Сушчанка ўвесь час нас падтрымлівала і натхняла, — кажа Андрусь Архіпенка. — З яе дапамогай было рэалізавана некалькі «адамовіцкіх» праектаў. І распачынаўся яшчэ адзін, які пакуль у рабоце. Летась мы з ініцыятыўнай групай заяўляліся на конкурс сацыяльных праектаў Social Weekend у спадзяванні выйграць грошы на добраўпарадкаванне тэрыторыі вакол помніка Адамовічу. Перамагчы не атрымалася, але нас падтрымаў прыватны спонсар, які перадаў на развіццё ідэі тысячу рублёў, і ААТ «Беларусбанк», які прызнаў наш праект найлепшым у рамках Года малой радзімы і пераліччыў на яго 10 тысяч рублёў (публікацыя ад 29.05.2019 — **Аўт.**). Мы ўжо набылі сцэну коштам 4200 рублёў для правядзення пасялковых святаў, дзве прыбіральні, а таксама тры паказальнікі і тры стэнды з інфармацыяй пра Адамовіча. Засталося ўсё гэта ўстанавіць на тэрыторыі Глушы.

Сёння абавязкі **старшыні Глушанскага сельскага Савета** выконвае новы не менш вопытны і дасведчаны работнік **Таццяна ПЛОСКАЯ.** І тое, што датычыцца ўшанавання імя Адамовіча, яна лічыць важным і неабходным, бо гэта спрыяе развіццю пасёлка і выхаванню падрастаючага пакалення. «Гэта тая адметнасць, якой можна толькі ганарыцца», — падкрэсліла Таццяна Плоская.

Што датычыцца музея, то збор сродкаў на рэканструкцыю будынка аптэкі пад яго працягваецца. Гэты рахунак існуе пры Бабруйскім райвыканкаме. Нагадаем, самы вялікі ўнёсак — пяць тысяч долараў у эквіваленце — зрабіла нобелеўская лаўрэатка, вучаніца Алеся Адамовіча — Святлана Алексіевіч. Розныя сумы пераліччылі працоўныя калектывы, у тым ліку Выдавецкі дом «Звязда», а таксама жыхары краіны. Апошнім часам паступленне сродкаў запаволілася, але ў нашых сілах усё змяніць.

**р/р BY84AKBB36421292723267100000 у філіяле 703 ААТ «ААБ Беларусбанк», БІК AKBBBY21703, УНП 701226324.**

**Прызначэнне плацяжу: «Для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча». Гэты доўгі сказ павінен быць пазначаны ў банкаўскім дакуменце абавязкова.**

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Андруся АРХІПЕНКІ.**

---

Паехалі!

# АПЛАЦІ ПРАЕЗД З МАБІЛЬНІКА

**Адчуць сябе нібыта героем аўтобуснага квэста, дзе заданне знайсці ў салоне «ключ», прайсці этапы і выйсці на новы ўзровень. Інавацыйную тэхналогію продажу электронных білетаў цяпер апрабуюць у Гомелі.**

Новы метад разліку за праезд і кантролю аплаты цяпер можа ажыццяўляцца па QR-коду. Працуе сістэма праз мабільную праграму «Аплаці», якую распрацавала беларуская IT-кампанія на базе плацежнай сістэмы банка. Скарыстацца паслугай могуць уладальнікі банкаўскіх картак і смартфонаў. Пры гэтым, быць утрымальнікам карткі канкрэтнага банка-ўладальніка плацежнай сістэмы не патрабуецца.

Гомель — першы з абласных цэнтраў, дзе аплаціць праезд можна па новай тэхналогіі. Праўда, такая функцыя пакуль даступна толькі на пэўных гарадскіх маршрутах. Аўтобусы звонку і ў салоне пазначаны наклейкамі з назвай мабільнай праграмы «Аплаці».

Ад пасажыра патрабуецца запусціць на тэлефоне праграму, накіраваць экран мабільніка на QR-код, сканіраваць яго. Выява, як ключ да віртуальнай плацежнай сістэмы, аўтаматычна дасць доступ да электроннага кашалька пасажыра. Застанецца толькі ўвесці кошт праезду і аплаціць у адзін клік. Пры гэтым доўга шукаць і прабірацца праз салон да пазначанага месца з QR-кодам не прыйдзецца.

Перавагі новай тэхналогіі тлумачыць **намеснік дырэктара кампаніі-распрацоўшчыка LWO Кірыл ТАЛЕЙКА:**

— Карцінка выдатна распазнаецца на адлегласці да двух метраў. Электронны квіток імгненна адлюструецца на экране смартфона. Тут жа захаваецца нумар білета, транспартнага сродку, прыналежнасць да пэўнага аўтобуснага парка, дата і час пакупкі, а таксама кошт праязнога дакумента.

У далейшым такім шляхам можна будзе набыць і праязныя. Увогуле, мабільная плацежная сістэма разлічана не толькі на продаж, але і на кантроль за электроннымі квіткамі.

— Праверка білета кандуктарам ажыццяўляецца гэтак жа проста, — уводзіць у курс справы **намеснік старшыні праўлення ААТ «Белінвестбанк» Андрэй САКІРКА.** — Пасажыр скануе QR-код на бэйджыку кантралёра. Калі аплата прайшла, то на экране мабільніка з'явіцца электронны квіток са статусам «Аплачана». Сэрвіс — абсалютна бясплатны.

Заўважныя плюсы ўжо ацанілі і кандуктары філіяла «Аўтобусны парк № 6» ААТ «Гомельаблаўтатранс». Новай сістэмай абсталяваны пакуль два аўтобусы. Але маршруты, па якіх яны рухаюцца па горадзе, штодня змяняюцца. У бліжэйшы час магчымасць віртуальнай аплаты з'явіцца ва ўсім транспарце філіяла. Гомель — другі горад у Беларусі па колькасці перавозак пасажыраў грамадскім транспартам пасля Мінска.

— Штодня гарадскі транспарт перавозіць каля 280 тысяч чалавек. На лінію выходзіць 210 аўтобусаў. Пры такіх маштабах вельмі важна ўкараненне сучасных тэхналогій аплаты праезду, — падкрэслівае **першы намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Гомельаблаўтатранс» Сяргей МАЦУКОЎ.** — Гэта першы этап замены састарэлай білетнай прадукцыі і пераходу да сучаснага фармату аплатнай сістэмы.



Укараненне такой тэхналогіі дазволіць прадпрыемствам-пасажыраперавозчыкам эканоміць сродкі на ўсталяванне дарагіх валідатараў — электронных прылад для аплаты праезду банкаўскай карткай. Грошы за праезд па новай тэхналогіі электроннага кашалька паступаюць адразу на рахунак перавозчыка.

Людзям, якія не маюць магчымасці карыстацца мабільнай праграмай, перажываць не варта: аплаціць праезд можна традыцыйным спосабам. У тым ліку і наяўнымі грашыма. Дарэчы, разлічыцца ў аўтобусе па новай тэхналогіі пакуль змогуць толькі грамадзяне Беларусі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

## ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении третьих повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Стройфинпроект» (УНП 690334841, г. Минск, ул. Беломорская, д. 21, пом. 142), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

***Дата и время проведения торгов***: **28 февраля 2020 года**. Начало – 14.00. Заявки принимаются с 13 февраля 2020 года по 27 февраля 2020 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, пр-т Победителей, 31–1, комната переговоров ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «Стройфинпроект» (УНП 690334841)** в лице антикризисного управляющего – ЧУП «Правовая компания «БелПрофКонсалт», тел. 8 (033) 653-38-17.

| № лота | Наименование | Начальная цена, руб. | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Машино-место с инв. номером 500/D-708047541, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, 48А-51, площадь 14,6 кв. м | 13 020,00 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ) | 5 % | 5 % |
| 2 | Машино-место с инв. номером 500/D-708047561, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, 48А-71, площадь 13,8 кв. м | 9380,00 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ) | | |
| 3 | 2/25 доли в праве на машино-место 500/D-708047522, расположенные по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, 48А-32, площадь 21,5 кв. м | 1120,00 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ) | | |

***Для участия в торгах необходимо:***

1. В срок до 17.00 **27 февраля 2020 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 17.00 27.02.2020 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 168 (29035) за 05.09.2019 г.; РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 201 (29068) за 22.10.2019 г.; РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 231 (29098) за 05.12.2019 г.

---

16 марта 2020 года в 13.00 состоится очередное общее собрание акционеров «ОАО «Элегант».

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2019 год и основные направления деятельности общества в 2020 г.
2. Отчет наблюдательного совета общества.
3. Утверждение годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2019 год.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков общества за 2019 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2020 г. и первом квартале 2021 г.
6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.

Место нахождения ОАО «Элегант»: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13–1.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13–1.

Время регистрации участников собрания в день проведения собрания с 12.30 до 13.00 по предъявлении документа, удостоверяющего личность (для представителя акционера – доверенность).

Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра акционеров по состоянию на 20 февраля 2020 г.

Акционеры могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня собрания в рабочие дни с 11.00 до 13.00, начиная с 20.02.2020 г., по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНН 400078331

---

## Извещение о проведении электронных торгов

| Организатор аукциона, оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: **www.ipmtorgi.by.** |
|---|---|
| Продавец | Частное предприятие «Платина-эстейт». Юридический адрес: г. Минск, ул. Сурганова, д. 27, пом. 6Н, каб. 3 |

**Предмет электронных торгов**

**Незавершенное законсервированное капитальное строение** (здание неустановленного назначения), общ. пл. 8258 кв. м, инв. № 334/U-11194. **Адрес:** Гомельская обл., Лельчицкий р-н, г. п. Лельчицы, ул. Меньшикова, 75Б. **Составные части и принадлежности:** двухэтажная кирпичная пристройка.
**Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве аренды по 23.10.2037 для содержания и обслуживания находящегося в государственной собственности незавершенного незаконсервированного капитального строения (здания столярного цеха), общ. пл. 1,7776 га

**Начальная цена (без НДС 20 %) – 227 368 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000; резидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на счет: в долларах США (**USD**) – **BY03BELB30120048350010226000;** в евро (**EUR**) – **BY70BELB30120048350030226000;** в российских рублях (**RUB**) – **BY85BELB30120048350020226000** в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32, БИК BELBBY2X, УНП 191224638, ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| Срок подписания договора купли-продажи | **10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона |
|---|---|

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **2 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**

Начало торгов: **18.03.2020 в 11.00.**
Окончание торгов: **18.03.2020 в 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 16.03.2020 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

**Контактные данные: +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: info@ipmtorgi.by**

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## Извещение о проведении повторного аукциона

| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
|---|---|
| Продавец | ОАО «Полесьеэлектромаш», 225644, Брестская область, г. Лунинец, ул. Красная, 179 |

**Предмет аукциона –** оборудование, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: Брестская область, г. Лунинец, ул. Красная, 179

| № лота | Инв. номер | Наименование оборудования | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 12556 | Токарно-винторезный станок 16К20 | 5639,30 |
| 2 | 12561 | Токарно-винторезный станок 16К20 | 5959,72 |
| 3 | 12701 | Токарно-винторезный станок 16К20 | 5369,26 |
| 4 | 12726 | Токарно-винторезный станок 16Е20 | 5772,60 |
| 5 | 12794 | Токарно-винторезный станок ГС-526 | 16 740,00 |
| 6 | 12518 | Токарно- винторезный станок 1М63 | 6829,96 |
| 7 | 17718 | Полуавтомат шлифовальный 3Е183В | 39 780,00 |
| 8 | 22040 | Фрезерный станок 6Р82Ш | 4920,00 |
| 9 | 22112 | Фрезерный станок УФ320 | 12 041,17 |
| 10 | 12769 | Токарно-винторезный станок 1В340Ф30 | 25 713,57 |
| 11 | 22092 | Фрезерный станок 65А60Ф4 | 246 730,21 |
| 12 | 12789 | Токарно-винторезный станок МК6056 | 15 540,00 |
| 13 | - | Пресс кривошипный КБ5535 | 299 021,64 |

**Задаток 10 % от начальной цены лота** перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| Срок подписания договора купли-продажи | **10** рабочих дней после проведения аукциона |
|---|---|

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 24.01.2020 г.

| Дата и время проведения аукциона | **26.02.2020** в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
|---|---|
| Дата и время окончания приема документов | **24.02.2020** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| Контактные телефоны | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

---

**ООО «Центр Белинвентаризация»
г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2–1**

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

## Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО «Гомельское ПО «Кристалл» – управляющая компания холдинга «КРИСТАЛЛ-ХОЛДИНГ», тел. 8 (0232) 27 95 41

| № лота | Наименование объекта | Стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Изолированное помещение (неустановленного назначения) с инв. № 350/D-14269, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Советская, 157, площадью 1031,3 кв. м по начальной цене – 130 200,00 руб.<br>– автоматическая система контроля и учета электроэнергии с инв. № 00435057 по начальной цене – 4560,00 руб.;<br>– кондиционер «DALKIN 09» с инв. № 00435081 по начальной цене – 768,00 руб.; – кондиционер «DALKIN 09» с инв. № 00435082 по начальной цене – 768,00 руб.; – кондиционер Tadilux TRM 07H с инв. № 00435083 по начальной цене – 456,00 руб.; – кондиционер Tadilux TRM 07H с инв. № 00435084 по начальной цене – 456,00 руб.;<br>– пункт распределительный, инв. № 00435105 по начальной цене – 480,00 руб.; – теплосчетчик «Комбиметр QII» с инв. № 00046236 по начальной цене – 336,00 руб.; – Электросчетчик с инв. № 00431720 по начальной цене – 444,00 руб.; – кабельные линии связи с пластмассовой оболочкой с инв. № 00003086 по начальной цене – 2520,00 руб.<br>Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000002004900 площадью 0,0911 га (доля права аренды – 12/25) | 140 988,00 | 14 098,80 |
